№№37–38
(2765–2766)

13 сакавіка 2008 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

Да ўвагі!
Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

Народная Воля

Шаноўныя чытачы!
Па пытаннях распаўсюджвання газеты жыхары сталіцы могуць звяртацца па тэлефоне 328-63-93, усе астатнія — па тэлефоне 328-68-71.

СКАНДАЛ

Пачатак халоднай вайны?

Паміж ЗША і Беларуссю грымнуў дыпламатычны скандал.

Сваімі каранямі гэты скандал, магчыма, бярэ пачатак яшчэ ад 2006 года, калі прэзідэнт ЗША Джордж Буш выдаў указ аб фінансавых санкцыях у адносінах да дзесяці беларускіх чыноўнікаў, якія мелі дачыненне да парушэнняў правоў чалавека і "тармажэння" дэмакратычных працэсаў.

У лістападзе 2007 года Міністэрства фінансаў замарозіла ўсе банкаўскія рахункі "Белнафтахіма", якія знаходзіліся пад юрысдыкцыяй ЗША. Рахункі не абавязкова маглі знаходзіцца ў Штатах, але і ў краінах Балтыі, Германіі, Расіі, Кітаі... А днямі на сайце Мінфіна ЗША быў надрукаваны дакумент, у якім нагадвалася, што суб'екты ЗША не могуць працаваць не толькі з "Белнафтахімам", але і з шэрагам іншых кампаній, да якіх беларускі канцэрн мае дачыненне.

— А я нікуды не паеду...

Рэакцыя афіцыйнага Мінска была амаль імгненная. Міністэрства замежных спраў Беларусі выступіла з афіцыйнай заявай:

"...Беларускі бок заяўляе, што крокі ў адказ Беларусі будуць мець жорсткі характар. Аб змесце гэтых крокаў амерыканскі бок быў раней пастаўлены ў вядомасць намі ў папярэднім парадку. Адным з такіх крокаў з'яўляецца адкліканне ў Мінск для кансультацый пасла Рэспублікі Беларусь у ЗША Міхаіла Хвастова. Адначасова ўрад Рэспублікі Беларусь настойліва прапануе паслу Злучаных Штатаў Карэн Сцюарт пакінуць нашу краіну з той жа мэтай. Беларускі бок асобна падкрэслівае, што, падпісаўшы Хельсінкскі заключны акт, ЗША, як і іншыя дзяржавы — удзельнікі АБСЕ, узялі на сябе абавязацельства "пры ўсіх абставінах утрымлівацца ад любога эканамічнага прымусу, накіраванага на падпарадкаванне сваім уласным інтарэсам ажыццяўлення іншай дзяржавай — удзельніцай правоў, прыналежных яе менталітэту".

Пад заявай стаяла дата — 7 сакавіка. А ўжо 10 сакавіка ў Мінск з ЗША прыляцеў і беларускі пасол спадар Хвастоў. Між тым у мінулы аўторак пасол ЗША ў Беларусі Карэн Сцюарт, як працавала ў Мінску, так і заставалася працаваць.

— Пасол — у Мінску, астатняе — пакуль без каментарыяў, — коратка паведаміў мне супрацоўнік прэс-службы Пасольства ЗША ў Беларусі Алесь Круглякоў.

— Мяне адклікалі ў Мінск...

Адным словам, сітуацыя зараз такая, што кропкі над "і" да канца так і не расстаўлены. Відавочна, што многае ў гэтай гісторыі магло б праясніцца, калі б вызвалілі Аляксандра Казуліна. А такую ўмову Захад выставіў беларускаму боку ўжо даўно.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

КОНТРПОГЛЯД

Аляксандр ДАБРАВОЛЬСКІ, член прэзідыума Аб'яднаных дэмакратычных сіл:

— На мой погляд, канфлікт нейкі несур'ёзны. Не бачу я ніякіх аргументаў, каб адклікаць зараз беларускага пасла, бо санкцыі супраць "Белнафтахіма" былі ўведзены яшчэ ў лістападзе мінулага года. Зараз, наколькі вядома, ніякіх дадатковых мер не прымалася. Амерыканцы цяпер проста патлумачылі, як прымяняюцца санкцыі.

Сам жа дыпламатычны скандал нагадвае мне сітуацыю, калі ў 90-х гадах на адным з прыёмаў адзін беларускі генерал пачаў расказваць аб тым, што НАТО — наш вораг. У адваротным, маўляў, яго ніхто не пераканае, бо так яго навучылі і да гэтага ён прызвычаіўся.

Мы таксама ў апошні час прызвычаіліся да таго, што перыядычна з усімі сварымся. З Еўрасаюзам, са Злучанымі Штатамі Амерыкі, з рознымі заходнімі структурамі, нават з Расіяй... Мы сварымся, але не задумваемся — а чаму нас не паважаюць? Дык, можа, трэба задумацца і нешта змяніць у сабе? Дарэчы, не выключаю, што скандал можа набыць нечаканы паварот у сувязі з арыштам некалькі дзён таму ў Тайландзе гандляра зброяй Віктара Бута, які падазраецца ў гандлі зброяй.. Апошні, напэўна, будзе перададзены ўладам ЗША, а той можа расказаць шмат цікавага аб гандлі зброяй з арабскімі краінамі. Калі верыць паведамленням СМІ, то Бут не працаваў напрамую, а дамаўляўся з дзяржавамі наконт продажу зброі таемна. Хто яго ведае — якія краіны тут могуць "усплыць" на паверхню?

САЛІДАРНАСЦЬ

Прэзідэнт ЗША Джордж Буш заклікаў беларускія ўлады тэрмінова вызваліць Аляксандра Казуліна

Злучаныя Штаты Амерыкі заклікаюць беларускія ўлады тэрмінова вызваліць Аляксандра Казуліна. Пра гэта, як паведамляе прэс-служба Белага дома, прэзідэнт ЗША Джордж Буш заявіў, выступаючы на ўрачыстай вечарыне ў гонар Гістарычнага месяца жанчын (у ЗША сакавік афіцыйна лічыцца месяцам жанчын).

Кажучы пра жанчын, якія па ўсім свеце змагаюцца за сваю свабоду і свабоду іншых людзей, Дж.Буш выдзеліў жонку экс-кандыдата ў прэзідэнты Беларусі Аляксандра Казуліна Ірыну, якая памерла 23 лютага ад анкалагічнага захворвання. *"Амерыка ўшаноўвае такіх жанчын, як Ірына Казуліна. Пасля таго, як яе муж быў асуджаны на пяць з паловай гадоў за пратэсты супраць фальсіфікацыі на прэзідэнцкіх выбарах 2006 года, Ірына нястомна змагалася за яго вызваленне. Пры гэтым яна стала голасам усіх палітычных зняволеных, якія ўтрымліваюцца беларускім рэжымам",* — сказаў Дж.Буш.

Ён падкрэсліў, што Ірына Казуліна таксама актыўна ўдзельнічала ў кампаніі па барацьбе з ракам малочнай залозы ў Беларусі. *"Некалькі тыдняў таму хвароба забрала яе жыццё. Для людзей важна зразумець, што гэтая цудоўная жанчына Ірына падрыхтавала глебу для таго, каб Беларусь, як мы спадзяёмся, стала свабодным, справядлівым і адкрытым грамадствам",* — заявіў Джордж Буш.

Таццяна КАРАВЯНКОВА.

МЫСЛИ ВСЛУХ

Мы живем, под собою не чуя страны

Широкий резонанс вызвала публикация в "Народной воле" за 7 и 8 февраля статьи "Мы живем, под собою не чуя страны". Тогда автор размышлял о прошлом, настоящем и будущем России и Беларуси, сегодня — о роли народа и власти в построении демократического государства.

Валерий КОСТКА, *подполковник КГБ (запаса), фермер-пчеловод с 1999 года.*

Народ

"Мы, народ Республики Беларусь (Беларуси)..." — так начинается Конституция Республики Беларусь.И дальше: "Единственным источником государственной власти и носителем суверенитета в Республике Беларусь является народ".

Известен тезис: "Власть для народа, а не народ для власти".

Можно вспомнить и иронические строки Леонида Филатова:

"Зря ты, Федя!.. Для меня
Мой народ — моя родня.
Я без мысли об народе
Не могу прожить и дня..

Утром мажу бутерброд —
Сразу мысль: а как народ?
И икра не лезет в горло
И компот не льется в рот!"

Все радеют за народ. Ни в одной стране мира власть не называет народ своим рабом, все признают власть народа. Потому, что по воле Всевышнего каждый человек наделен одинаковыми правами, свободами и законными интересами. Именно объединенная воля и согласие граждан конкретной страны по правилам отношений и поведения определяют ту систему власти и приоритеты развития данной страны. Власть и оппозиция — это производные от народа.

Тогда возникает закономерный вопрос, почему в разных странах и так по-разному живет народ? Почему одни народы живут в свое удовольствие и процветают, а другие, выражаясь словами поэта, живут, "под собою не чуя страны"? В чем секрет этой несправедливости? Может, в самом народе? Но ведь не бывает умных или глупых народов. Все созданы по образу и подобию. Все наделены разумом.

С моей точки зрения, причина скорее всего кроется **в осознании каждым народом своей роли и исторической миссии в конкретный исторический момент, — как первоисточника власти. Власть народа — в переводе и означает такое понятие, как демократия**. Если народ осознает свою власть, то устройство государства как системы власти и управления определяется как демократическое, и законы, принимаемые парламентом, носят демократичный характер и выборы власти происходят демократическим путем. Если народ в силу определенных причин (об этом ниже) не осознает себя первоисточником власти, его место занимает другая сила (свято место пусто не бывает). Любые проявления бюрократии, автократии или даже диктатуры (причем именно за ширмой демократии) — это и есть ослабление власти народа.

Именно разум народа, его сознание является главным объектом атаки со стороны тех, кто удобно устроился в *"креслах власти"*, обеспечен необходимым и не желает что-либо менять. Поэтому и создается целая система идеологической обработки *"мозгов"* народа, причем с одной идеологической теорией, разъясняющей народу правильность выбранного пути развития, успехов в развитии, незыблемости народовластия и соблюдения прав и свобод граждан нашего общества. Все другие идеологии, мнения и т.д. подвергаются яростным атакам, если вообще где-то озвучиваются.

В 1994 году, когда принималась Конституция Республики Беларусь, законодатель учел пагубность подобных идеологий и в статье 4 записал: **"Демократия в Республике Беларусь осуществляется на основе многообразия политических институтов, идеологий и мнений"**.

Это позволяет народу думать, анализировать и делать научно обоснованные выводы. Это позволяет искать и находить истину и двигаться вперед, осознанно, адекватно ощущая и себя, и свою страну.

Идеология, вне конкурентной среды и в статусе государственной — это опиум для народа. Именно с помощью этого опиума народ вводится в состояние, когда живет, "под собою не чуя страны". Это состояние наркомана после очередной дозы наркотика. Наркотик парализует разум и вызывает эмоциональное возбуждение, пробуждая инстинкты животного.

Может возникнуть вопрос, а кто вообще должен определять приоритеты и направления движения для народа? Сам народ и должен это делать. А правильнее будет сказать — ответственность за цели и идеи должна брать на себя наиболее образованная и культурная часть народа — интеллигенция. Причем интеллигенция, у которой духовное начало доминирует над материальным. Белорусская земля не обделена Богом на таких поводырей народных. Ф.Скорина, К.Астрожский, М.Богданович, Я.Купала, Я.Колас, В.Короткевич, А.Адамович, В.Быков, целая плеяда политических деятелей БНР, ныне здравствующих Н.Гилевич, Р.Барадулин, Г.Буравкин, А.Марочкин и многие другие — просто невозможно всех перечислить. Вспомним Я.Коласа:

"Я адплаціў народу,
Чым моц мая магла,
Зваў з путаў на свабоду,
Зваў з цемры да святла".

Так, зваць з путаў на свабоду, зваць з цемры да святла - главное призначение народных поводырей. Они и есть Ум, Честь и Совесть нашего народа.

К сожалению, духовное не всегда способно к противостоянию с материальными инстинктами. И именно на отношениях власти с интеллигенцией, как на лакмусовой бумаге, проявляется доминанта и самой власти. Если во власти преобладает духовная составляющая, то и, соответственно, востребуется и интеллигенция с такой же составляющей. В противном случае востребуется интеллигенция, которая готова продать свои *"мозги"* за материальные блага, и умно, и красиво обосновать идеологию правящей элиты. Но все труды и произведения этой категории живут ровно столько, сколько находится у власти данная политическая сила. Поскольку все их творения не представляют ни культурной, ни исторической, ни художественной ценности, более чем на нетрадиционный источник печного топлива они и не годятся.

(Окончание на 2-й стр.)

Беларускі тыдзень у Страсбургу

Ля Еўрапарламента гэтымі днямі лунае бел-чырвона-белы сцяг — як напамін пра 90-годдзе Беларускай Народнай Рэспублікі і пра тое, што народ Беларусі быў і будзе ў ліку вольных народаў вольнай Еўропы. У аўторак у Страсбургу пачаўся "беларускі тыдзень".

Гасцямі "Беларускага тыдня" будуць старшыня Еўрапарламента **Ганс-Герт Потэрынг**, кіраўнік парламенцкага камітэта па замежных сувязях **Яцэк Сарыюш-Вольскі**, кіраўнік фракцыі Еўрапейскай народнай партыі — Еўрапейскіх дэмакратаў **Джозэф Доўл** і многія іншыя ўплывовыя еўрапейскія палітыкі. Куратарам гэтага праекта ад імя Еўрапарламента выступіў кіраўнік дэлегацыі па сувязях з Беларуссю **Яцэк Пратасевіч**.

Праграма "Беларускага тыдня" вельмі разнастайная. Тут і палітычныя дыскусіі, і "культурная размінка" — паказ фільма рэжысёра Юрыя Хашчавацкага "Плошча", выставы мастакоў Алеся Марачкіна і Рыгора Сітніцы, фатографаў Ігара Крашэўскага і Адама Тухлінскага, выступленні беларускіх музыкантаў.

"Незалежная Беларусь - неад'емная частка Еўропы, — пад такім дэвізам праходзіць "Беларускі тыдзень". Па вяртанні беларускай дэлегацыі ў Мінск, пра ўсё, што адбывалася ў Страсбургу, мы раскажам падрабязна.

Алег СНОЎ.

ТАК И СКАЗАЛ

Александр ПОПКОВ, заместитель главы Администрации президента Республики Беларусь (во время выступления на заседании Совета министров 11 марта):

«Мы сегодня производим 70% убыточной продукции в растениеводстве и в животноводстве. Мы заходим в тупик».

На скамье подсудимых — 28 человек...

В Витебском областном суде рассматривается уголовное дело так называемой банды Ринаса. Этот процесс может стать самым массовым в новейшей истории Беларуси.

На скамье подсудимых находятся 28 человек, среди которых организатор преступной группы Ринас. Они обвиняются в совершении тяжких и особо тяжких преступлений: организация и участие в преступной организации, вымогательства, кражи, грабежи, мошенничество, уничтожение и повреждение имущества, похищение людей.

Преступная группа действовала на территории Витебска и Шумилинского района на протяжении 10 лет — с 1996 года и совершила более 100 преступлений.

БЕЛАРУСЬ—ЕЎРОПА

Прадстаўніцтва, за якое прыйшлося пазмагацца

У Бруселі падпісана Пагадненне паміж урадам Рэспублікі Беларусь і Камісіяй еўрапейскіх супольнасцяў аб заснаванні, прывілеях і імунітэтах прадстаўніцтва Еўракамісіі ў Беларусі.

Свае подпісы пад дакументам паставілі намеснік міністра замежных спраў **Валерый Варанецкі** і камісар Еўрасаюза па знешніх сувязях і палітыцы добрасуседства **Беніта Ферэра-Вальднер**.

З запытам аб магчымасці адкрыцця ў Мінску свайго прадстаўніцтва Еўракамісія звярнулася да беларускіх улад у 2005 годзе. 19 кастрычніка 2007 года праект адпаведнага пагаднення быў ухвалены ўказам прэзідэнта Беларусі.

У пагадненні, у прыватнасці, зазначаецца: *"Беларусь прадастаўляе на ўмовах узаемнасці прадстаўніцтву, яго кіраўніку і членам, а таксама членам іх сем'яў, якія жывуць разам з імі, правы, прывілеі і імунітэты, прадугледжаныя Венскай канвенцыяй аб дыпламатычных зносінах ад 18 красавіка 1961 года для дыпламатычных прадстаўніцтваў (у прыватнасці, недатыкальнасць памяшканняў, карэспандэнцыі і архіваў, імунітэт ад крымінальнай юрысдыкцыі, падатковыя льготы)".*

Дакумент увайшоў у сілу з моманту падпісання. Як патлумачыў БелаПАН кіраўнік мінскага офіса TACIS **Яніс Айзсалніекс**, фармальна гэта азначае, што 7 сакавіка ў Мінску адкрыецца прадстаўніцтва ЕК. Паводле яго слоў, з Бруселя толькі павінна прыйсці паведамленне аб тым, хто будзе кіраваць місіяй. Кіраўніком місіі павінен быць прызначаны **Жан-Эрык Хольцапфель** — цяперашні паверaны ў справах Беларусі ў кіеўскім прадстаўніцтве ЕК. Кіраўнік прадстаўніцтва ў Мінску будзе мець ранг пасла, як і кіраўнік офіса АБСЕ.

"Я шчыра спадзяюся, што адкрыццё ў Мінску прадстаўніцтва Еўракамісіі створыць умовы для далейшага развіцця нашых адносін", — заявіла камісар Еўрасаюза па знешніх сувязях і палітыцы добрасуседства Беніта Ферэра-Вальднер.

"У гэты важны для нас дзень я хачу нагадаць аб прапановах Еўрасаюза Беларусі, — сказала еўракамісар. — *Мы гатовы зноў аднавіць стасункі з Беларуссю і развіваць іх, як толькі Беларусь зробіць пэўныя істотныя крокі ў кірунку дэмакратызацыі".*

Б.Ферэра-Вальднер падкрэсліла, што адкрыццё прадстаўніцтва Еўракамісіі ў Мінску і вызваленне некалькіх палітычных зняволеных у студзені-лютым гэтага года "можа дапамагчы закласці добры фундамент" для двухбаковых стасункаў. *"Я з нецярпеннем чакаю пацвярджэння гэтых сігналаў вызваленнем Аляксандра Казуліна",* — заявіла Б.Ферэра-Вальднер.

Марына РАХЛЕЙ, Таццяна КАРАВЯНКОВА.

Сяргей Парсюкевіч — за кратамі

Следчы Маскоўскага раёна Мінска Зміцер Разанка прыняў рашэнне пакінуць за кратамі віцебскага прадпрымальніка Сяргея Парсюкевіча. Рашэнне было абвешчана ў адсутнасць адваката Парсюкевіча Веры Страмкоўскай.

Супраць Парсюкевіча 31 студзеня была заведзена крымінальная справа па артыкуле 364 КК ("гвалт, альбо пагроза гвалту ў адносінах да работніка міліцыі"). Прадпрымальніку пагражае да шасці гадоў зняволення. Абвінавачванне зводзіцца да таго, што падчас адбыцця 15-сутачнага арышту на Акрэсціна Парсюкевіч збіў намесніка дзяжурнага Аляксандра Длупа. Цікава, што справа была заведзена пасля таго, як Парсюкевіч, выйшаўшы з ізалятара на Акрэсціна, прадэманстраваў грамадскасці пабоі на сваім целе і заявіў, што былыя калегі, паводзілі сябе ў ізалятары неймаверна жорстка і фактычна проста збілі яго.

Пасля гэтых заяў справа і закруцілася. Прадпрымальнік спачатку быў арыштаваны на трое сутак. Але пасля гэтага тэрміну было прынята рашэнне аб змяшчэнні яго ў СІЗА.

Нагадаем, што пасля мітынгу прадпрымальнікаў па такім жа абвінавачванні ў СІЗА знаходзіцца маладзёжны актывіст Андрэй Кім. Сяргей Парсюкевіч жанаты, мае непаўналетняга сына. Адвакаты і грамадскасць зараз дабіваюцца яго апраўдання і вызвалення.

Алег СНОЎ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
13 САКАВІКА 2008 г.

МЫСЛИ ВСЛУХ

Мы живем, под собою не чуя страны

(Окончание. Начало на 1-й стр.)

Вне конкурентной среды любую идеологию можно превратить в сильнейший наркотик. Теперь, когда есть информация, а общенародный обман и идеологический угар сдуло *"ветром перемен"*, можно проанализировать и историю государственного переворота в России в начале XX века. Старший сын в семье Ульяновых, Александр, — преступник-террорист, но идеологией возведен в герои. Да и как же: у вождя пролетариата в семье не может быть преступников. Сам Владимир Ульянов-Ленин — агент немецкой разведки, на немецкие деньги через Парвуса организовал вооруженный захват власти. На языке закона — это особо опасное преступление. Соучастники — Сталин, Дзержинский и др. — уголовные преступники, грабившие банки для целей вооруженного переворота. Но в идеологии — они герои, потому что боролись за интересы трудового народа. Они ведь обещали землю крестьянам, а фабрики — рабочим. В итоге крестьянство как класс было ликвидировано, всех согнали в колхозы и заставили *"пахать"* на государство, которое жировало, а сам народ нищенствовал на трудодни. Если память мне не изменяет, ни одна фабрика рабочим не досталась.

Обман должен быть чудовищным, чтобы в него поверили. И он был чудовищным, потому что поверили сотни миллионов, и не только в СССР. Народ *"кормили"* обещаниями скорого коммунизма. Выдумывали лозунги, где народ — это все, а власть — это слуги народа. А народ как-то и не задумывался, почему в богатейшей стране мира с ее природными ресурсами слуги живут хорошо, а вот хозяин-народ как-то не очень. А какие впереди были перспективы! От каждого по способностям — каждому по потребностям. Не понимаю только в этой связи Г.Зюганова. Б.Ельцин осуществил заветную мечту коммунистов в России. Все взяли по потребностям. Правда, с одним *"маленьким"* уточнением. Ресурсов богатейшей страны мира не хватило, чтобы удовлетворить потребности всех. Досталось только тем, кто ближе к *"золотому корыту"* оказался. И то пришлось некоторых за границу сплавить, а кого-то в тюрьму упрятать, чтобы разделить и их *"потребности"*.

Интеллигенция, востребованная советской властью, работала на полную мощь. Стоит ли перечислять и юристов вышинских, и биологов, уничтожавших генетику, писателей революции. Их имена забываются, произведения превращаются в макулатуру. Вдумайтесь только в поэзию революционной литературы: *"Безумству храбрых поем мы песню"*. Господа, безумство — это медицинский диагноз. Безумство необходимо лечить. А ведь пели ему песню. И это все результаты идеологии, возведенной в ранг государственной политики. Преступники становились героями. Герои превращались во врагов народа. Безумству пели песни, а разум погибал в психушках. Но, несмотря ни на что, и следует на это обратить внимание, духовное начало все равно в муках и страданиях победило в этой тяжелейшей схватке. Именно те, кого расстреливали в ГУЛАГах, кого истязали по тюрьмам, кого изгоняли из страны — они победили, вошли в историю, их произведения и научные труды живы и востребованы обществом.

Пытаясь проанализировать и понять, что происходит с нами, с нашей страной, каждый раз я наталкиваюсь на мысль, что все это уже было в нашей истории, про это уже писал О.Мандельштам. Или мы больше других поверили в этот чудовищный обман, или не сделали выводов из истории. Может, поэтому нас Всевышний решил оставить *"на второй год"* для изучения краткого курса ВКП(б) с его советским совхозно-колхозным строем? История, как известно, повторяется дважды, один раз в виде трагедии, второй — в виде фарса. Изучить краткий курс, ясно, не для того, чтобы претворить в жизнь идею безумных — осуществить мировую революцию с другом Уго. Других-то уже и не осталось. Самому бы другу продержаться до конца второго срока. Изучить краткий курс, чтобы больше желания не появлялось заниматься самообманом и наступать на *"грабли"* истории.

Что такое идеология на практике, могу привести пример. Пригласили меня в прошлом году коллеги на торжественное собрание ветеранов и сотрудников военной контрразведки, посвященное Победе советского народа в ВОВ. 14 лет не встречались, думаю, схожу. Поразило выступление помощника министра обороны по воспитательной работе, целого генерала (фамилию даже и не пытался запомнить). Идеологические клише времен брежневых — черненко — это мелочи. Ну, начитался в детстве или в политучилище будущий генерал краткого курса ВКП(б), хорошо усвоил и не может забыть — это понятно. Всякие *"подлецы горбачевы и демократы"* — это стандарт и *"джентльменский набор"* аргументов политработника с мышлением времен доисторического материализма, здесь все тоже понятно и даже реагировать на это не хочется. Поразила оценка нынешней ситуации. *"Расплодили всяких частных предпринимателей, фермеров..."* и т.д.

Сотрудник МО в звании генерала не понимает, что ЧП и фермеры производят конкретные продукты, услуги, создают рабочие места, платят работникам зарплату и ничего у государства не берут и не просят, главное, чтобы государство не мешало им работать. Более того, они вносят свой вклад в консолидированный бюджет государства, за счет которого содержится в том числе и армия, и такие вот генералы *"горячего цеха"* (так в мое время называли между собой офицеры политработников). И если подобные идеи этот генерал озвучивает и в войсках, что вполне вероятно, — это имеет свои негативные последствия для нашего общества. Такими идеями он противопоставляет наших белорусских солдат и офицеров нашим гражданам, которые приносят обществу только пользу. Их деятельность регулируется законом и польза очевидна. Какая польза от таких генералов и нужно ли тратить народные средства на их содержание в войсках? Раньше, по крайней мере, кому-то нужно было пропагандировать теорию марксизма-ленинизма и роль КПСС. Теперь этого нет. Отношениями в коллективах военнослужащих занимаются профессиональные психологи. А что нынче делать в войсках политработникам, которые сейчас называются замами по воспитательной работе?

Все надуманные идеологии не выдерживают испытания временем. Вся армия идеологов, потребляющая немалые бюджетные средства, абсолютно не нужна. Лучше направить эти деньги на помощь тем, кто в них нуждается — ветеранам войны, "афганцам", многодетным семьям. Это будет лучшая идеология государства.

И коль скоро законодатель записал в Конституции, что *"Народ — первоисточник власти"*, то и не надо одурманивать его всякими идеологиями, работающими на эмоциональном уровне. Надо предоставить нашим гражданам широкий доступ к объективной, достоверной и своевременной информации и тогда с помощью своего разума народ и примет решения, и претворит их в жизнь. И будет жить, не только чувствуя под собою страну, но будет и гордиться нашей страной — Республикой Беларусь.

Смолевичский район.

БЕЛАРУСЬ—ЕЎРОПА

Квасьнеўскі выступае за дыялог з Лукашэнкам

Былы прэзідэнт Польшчы лічыць, што адзіным шляхам, які можа прывесці да зрухаў у бок дэмакратызацыі Беларусі, з'яўляецца дыялог з беларускімі ўладамі. Квасьнеўскі заявіў, што бачыць сябе ў якасці "піянера, які прабівае сцяну". Ён хоча размаўляць як з беларускімі ўладамі, так і з прадстаўнікамі дэмакратычнай апазіцыі.

— Мы лічым, што калі не весці перамовы з уладамі, прадстаўнікамі бізнесу, з людзьмі, якія звязаны з сённяшняй уладай, то гэта не прынясе ніякага выніку... Канцэпцыя санкцый і ізаляцыі не мае сэнсу, — менавіта так, як паведамляюць польскія СМІ, заявіў Квасьнеўскі. Ён таксама адзначыў, што сітуацыя ў Беларусі паціху змяняецца ў лепшы бок, а прыкладам гэтага з'яўляецца вызваленне палітычных вязняў і тое, што апазіцыянеры маюць хаця б мінімальную прастору для дзеяння.

АКЦЫЯ

Беларуская дыктоўка адбудзецца!

— Аргкамітэт па правядзенні беларускай дыктоўкі ў гонар 90-годдзя БНР атрымаў шмат нарэзак для складання ўзорнага тэкста, — гаворыць ініцыятар акцыі **Уладзімір ПАДГОЛ**. — Некаторыя я хацеў бы прапанаваць увазе чытачоў "Народнай волі". Мы атрымалі таксама цікавыя прапановы па арганізацыі дыктоўкі і таксама хочам вынесці некаторыя з іх на абмеркаванне.

Нагадаю ўмовы агульнанацыянальнай дыктоўкі:

1.Тэкст, які вы напішаце, не абавязкова здаваць на праверку. Яго вы можаце захаваць у сваім архіве. А калі хочаце ўдзельнічаць у конкурсе, то напачатку пазначце "тарашкевіца" ці "наркамаўка", пішыце і дасылайце: Мінск, Румянцава 13, ТБМ, "Дыктоўка".

2.Вазьміце на дыктоўку кнігу пісьменніка з любімымі творамі.

3. Пішыце сем'ямі. Калі дзеткі малыя, хай малююць побач з вамі.

4.Зрабіце фотаздымкі пра тое, як вы пішаце дыктоўку, каб на здымку была побач з Вамі і любімая кніга. Пастаўце яе, ці вазьміце ў руку. Фотаздымкі дасылайце: Мінск, Румянцава, 13, ТБМ, "Дыктоўка". Лічбавыя здымкі: siadziba@gmail.com; p_vlad@tut.by

Прапанова для тэкста дыктоўкі ад спадарыні А.Анісім

"Прызнаваецца радзіме ў сваёй любові да яе трэба ціхім, сціплым і нават крыху сарамлівым голасам — такім, якім прызнаюцца ў сваіх самых цнатлівых і непапраўных пачуццях. Інакш нельга. Інакш яна, Радзіма, падумае, што ты і сам у такое не верыш і крычыш так толькі таму, каб пераканаць у гэтым усіх, а заадно і самога сябе".

Янка Сіпакоў.

Прапанова аб прызнанні ў любові да Радзімы ціхім голасам выклікала пярэчанні ў некаторых сябраў аргкамітэта па той прычыне, што беларусы і так вельмі ціха гэта робяць. А вы як думаеце, шаноўныя чытачы?

Прапанова па арганізацыі дыктоўкі ад настаўніка Рыгора Шундрыка з Дзятлава

Шаноўны сп. А.Трусаў!

Шаноўны сп. Ул.Падгол!

Прапанова Падгола аб правядзенні агульнанацыянальнай дыктоўкі цікавая і важная. І пры належнай падрыхтоўцы можа быць ажыццёўлена і прынесці добры плён на карысць беларускай мове і нашай краіне. Хачу выказаць некалькі меркаванняў

1. Падрыхтоўку і правядзенне а/н дыктоўкі трэба ажыццяўляць не насуперак уладзе (як было ў канцы 90-х гадоў з так званымі альтэрнатыўнымі прэзідэнцкімі выбарамі), а пры максімальна магчымым супрацоўніцтве з уладнымі структурамі. Для гэтага ТБМ хай накіруе ў адпаведныя структуры прапановы, неабходныя тлумачэнні і тэкст мяркуемай дыктоўкі. І ўсё гэта — аператыўна даць у шырокі друк.

2. Супрацоўніцтва з уладамі можа стаць значным, калі будзе прапанаваны ўзаемапрымальны тэкст дыктоўкі. Такі тэкст, на маю думку, павінен быць складзены з выступленняў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь на тэму незалежнасці Беларусі (у тым ліку навагодняга віншавання) і яго выказванняў апошніх 2-3-х гадоў, прысвечаных беларускай мове, у перакладзе, зразумела, на беларускую мову.

3. Даводзіць чыноўнікам, што іх удзел у падрыхтоўцы і правядзенні агульнанацыянальнай дыктоўкі не будзе адступленнем ад прынцыпаў, а паслужыць справе ўмацавання незалежнасці Рэспублікі Беларусь, і ў год парламенцкіх выбараў будзе карысным для іх іміджу.

4. Значыць: За незалежную Беларусь!

P.S.

Мова дыктоўкі — сучасная, літаратурная. Калі хто хоча пісаць на тарашкевіцы, няхай піша.

"Нашы людзі" прымуць актыўны ўдзел у мерапрыемстве, хай убачаць і адчуюць, што дыктоўка падтрымліваецца ўладамі.

ДА ВЕДАМА

Як праходзіла агульнанацыянальная дыктоўка ў Польшчы?

Ініцыятаркай агульнарэспубліканскага лінгвістычнага конкурсу была радыёжурналістка з горада Катавіцэ Крыстына БОХЭНЭК, цяперашняя сенатарка.

Як яна сама расказвае, у 1985 годзе, пасля нараджэння дачкі, яна была ў дэкрэтным адпачынку, мела шмат часу, слухала радыё і глядзела тэлебачанне. Яе непрыемна ўражвала неахайная мова палітыкаў, прымітыўная тэрміналогія, збітыя фразы і наогул дрэннае знаёмства са сваёй роднай мовай на вуліцы і ў розных СМІ. Вось тады яна даведалася, што вядомы французскі публіцыст Бярнард Півот, які займаўся пытаннямі культуры, з дапамогай Універсітэта Сарбоны і Міністэрства культуры Францыі арганізаваў чэмпіянат краіны па французскай арфаграфіі. Бохэнэк выказвала, што калі праверка знаёмства з роднай мовай мае сэнс у французаў, дык з улікам складанай арфаграфіі польскай мовы — тым болей конкурс мае сэнс у Польшчы.

Пры падтрымцы ўлад

Пасля адпачынку Крыстына Бохэнэк падзялілася сваімі думкамі з кіраўніцтвам Польскага Радыё ў Варшаве, і тое падтрымала яе ініцыятыву. Годам пазней адбыўся Кангрэс культуры польскай мовы. Журналістка з'явілася на Кангрэсе, размаўляла з выдатнымі мовазнаўцамі і прапанавала прафесару Валеру Пісарку, каб той узначаліў журы. Прафесар ды іншыя мовазнаўцы пагадзіліся, і такім чынам у 1987 годзе ў сядзібе рэгіянальнага аддзялення Польскага Радыё адбылася першая дыктоўка з удзелам некалькіх соцень чалавек.

Варта адзначыць, што гэта адбывалася яшчэ пры камунізме, на бюджэтныя сродкі дзяржаўнага радыё і тэлебачання, Акадэміі навук і Міністэрства культуры. Ад пачатку 70-х гадоў да часу ўступлення Польшчы ў Еўрасаюз у краіне праводзіўся курс на моўную і культурную уніфікацыю. Маўляў, "усе мы жывём у Польшчы, і ўсе мы — палякі". Цяперашні ўрад таксама падтрымлівае прапагандаванне польскай мовы як карыснае і патрэбнае.

Як праводзіцца дыктоўка?

Пачаткі былі сціплыя, але з кожным годам удзельнікаў было ўсё больш. Аргкамітэт выпрацаваў дакладныя правілы конкурсу, названага "агульнанацыянальнай дыктоўкай". Ахвотныя выказаць свае веды павінны былі своечасова запоўніць і прыслаць сваю заяўку. Прымаецца абмежаваная колькасць заявак, не болей як 6 тысяч, бо гэтулькі чалавек змяшчаецца ў вялікай канцэртна-спартыўнай зале ў Катавіцэ.

Конкурс праводзіцца ў дзвюх асноўных узроставых групах: да 16 гадоў і старэйшыя за 16. Яны павінны без аніякіх слоўнікаў і энцыклапедый, без дапамогі звонку напісаць спецыяльны складаны тэкст, падрыхтаваны нейкім філолагам, альбо атрыманы ў рамках асобнага конкурсу на найлепшую дыктоўку. Кожны дарослы паляк можа прапанаваць свой тэкст дыктоўкі памерам да 220 знакаў і атрымаць за гэта ўзнагароду 4 тысячы долараў. Тэксты, як правіла, вельмі складаныя, з вялікай колькасцю слоў з розных галін ведаў, з назвамі рэдкай фауны і флоры. Зачытвае іх прафесійны дыктар альбо акцёр. Польская арфаграфія, дарэчы, надзвычай складаная. Шмат слоў і літар аднолькава вымаўляюцца, але па-рознаму пішуцца.

Тэхнічны бок

Удзельнікі конкурсу прыязджаюць у Катавіцэ, пасяляюцца і харчуюцца за свой кошт. Першапачаткова ўзнагароды былі чыста сімвалічныя, але паступова тры галоўныя пераможцы атрымлівалі ўсё больш каштоўныя ўзнагароды — да 15 тысяч долараў, а яшчэ два дзесяткі чалавек — рэчавыя ўзнагароды. Калі правільных адказаў шмат — праводзіцца дадатковы конкурс сярод тых, хто напісаў беспамылкова. З 1993 года ў рамках дыктоўкі праводзяцца дадатковыя конкурсы для палітыкаў, акцёраў, спартсменаў і бізнесменаў. Сама дыктоўка трансліруецца ў жывым эфіры па дзяржаўным радыё і тэлебачанні, і ў гэты дзень сотні тысяч людзей сядзяцца перад тэлевізарамі і радыёпрыёмнікамі, каб паспрабаваць свае сілы і паўдзельнічаць у дыктоўцы.

Пашырэнне конкурсу

Агульнарэспубліканская дыктоўка стала настолькі папулярнай, што яе цягам году пачалі асобна праводзіць на абласных альбо гарадскіх узроўнях. Паводле меркаванняў настаўнікаў, у цяперашні час дыктоўка стала тым болей патрэбна, паколькі моладзь усё меней чытае, пашыраецца ўплыў масавай культуры і ўжыванне іншамоўных слоў, а мова інтэрнету і эсэмэсак мае мала супольнага з арфаграфіяй. І гэта пры тым, што польскай мове не пагражае маргіналізацыя, няма той небяспекі з боку расійскай мовы, як гэта адбываецца ў некаторых былых савецкіх рэспубліках. Проста шмат хто ўсведамляе, што сучасная мова становіцца ўсё больш спрошчанай і прымітыўнай. Зразумела, падчас такіх дыктовак здараецца шмат неспадзевак і забаўных гісторый, бо аказалася, што дрэнна ведаюць арфаграфію роднай мовы тыя, хто павінен яе ведаць: супрацоўнікі папулярных выданняў, настаўнікі. Нават прафесійныя мовазнаўцы робяць памылкі і прызнаюць, што з-за гэтага яны саромеюцца ўдзельнічаць у конкурсе.

АБЗАЦАМ

Таццяна Кім сустрэлася з сынам

Сустрэча адбылася ў следчым ізалятары на Валадарскага, дзе знаходзіцца маладзёжны актывіст. *"Ягоную справу перадаюць у суд, таму мне і далі сустрэчу. Сын трымаецца мужна, на ўмовы не скардзіўся, не траціць надзеі, што хутка выйдзе на волю. Усім дзякуе за падтрымку, віншуе з надыходам вясны і перадае віншаванні з 25 сакавіка"*, — распавяла Таццяна Кім.

Не па тэлебачанні

Аляксандр Лукашэнка выказаў жаданне паехаць у Пекін на Алімпійскія гульні. На дадзены момант Нацыянальны Алімпійскі камітэт рыхтуе яго візіт у Кітай. Як заявіў першы віцэ-прэзідэнт НАК Генадзь Аляксеенка, "усё неабходнае для паездкі прэзідэнта Нацыянальнага Алімпійскага камітэта мы маем на ўвазе і рыхтуем. Такое жаданне ў прэзідэнта ёсць".

Спачатку знікнуць піва і цыгарэты, а потым і самі шапікі

Міністэрства гандлю прапануе забараніць гандаль півам і цыгарэтамі ў камерцыйных шапіках на прыпынках. Мінгарвыканкам пагадзіўся, бо ўсё адно збіраецца іх прыбіраць. Прадпрымальнікі гатовы адмовіцца ад гэтых тавараў, толькі б дазволілі працаваць.

Лічба д'ябла

За апошнія гады ў Беларусі з'явілася 666 аграгарадкоў. Пра гэта паведаміла прэс-служба ўрада напярэдадні пасяджэння Саўміна па пытаннях выканання праграмы развіцця вёскі. Больш за ўсё аграгарадкоў з'явілася на Міншчыне — 133. Менш за ўсё на Гродзеншчыне — 102.

Склады — пад завязку

Амаль 67% прадукцыі, вырабленай у студзені прадпрыемствамі Магілёўшчыны, засталіся на складах. За першы месяц года непрададзенай прадукцыі паболела на 73 мільярды рублёў. На складах застаецца прадукцыя хімічнай ды нафтахімічнай галіны, машынабудавання і металаапрацоўкі. Ёсць праблемы з продажам мэблі і абутку мясцовай вытворчасці.

Гастарбайтэраў бяруць на ўлік

Гаспадаркі Чавускага раёна шукаюць спосабы спыніць паездкі людзей на заробкі ў Расію. Падлічана, што рэгулярна туды выязджаюць каля пяцісот чалавек. Тым часам у раёне нестае працоўнай сілы. Чыноўнікі прызнаюць, што працаўладкаваць усіх ахвотных могуць, але аплаціць іх працу, як у Расіі, не змогуць, і пакуль яны знайшлі толькі адно выйсце з сітуацыі. Як паведамляюць мясцовыя СМІ, у раёне пачалі складаць спісы людзей, якія рэгулярна ездзяць на заробкі ў Расію. Напэўна, следам іх пацягнуць у падатковую інспекцыю.

Знаходка ў Полацку

Паблізу Полацкай езуіцкай калегіі археолагі знайшлі рэшткі будынкаў і пабудоў XVII стагоддзя, а таксама фрагменты керамікі і прылады працы, якія адносяцца да гэтага ж часу. Вывучэнне сабраных прадметаў дазволіць атрымаць больш дакладныя звесткі пра арганізацыю побыту палачан чатыры стагоддзі таму, сцвярджаюць спецыялісты.

Даведзеныя да адчаю...

Адразу дзве прадпрымальніцы — Яўгенія Бочурная і Святлана Дваранінава — галадаюць зараз у беларускіх турмах.

Яўгенія Бочурная аб'явіла галадоўку ў Віцебскім СІЗА. У свой час яна была асуджана на 5 гадоў пазбаўлення волі па абвінавачванні ва ўхіленні ад пагашэння крэдыторскай запазычанасці, адсядзела ў калоніі амаль два гады і выйшла па амністыі. Але прыкладна праз тыдзень... жанчыну зноў арыштавалі і адправілі за краты. Аказваецца, на пасяджэнні Прэзідыума Віцебскага абласнога суда было вырашана папярэдняе рашэнне гарадскога суда г.Наваполацка адмяніць, справу накіраваць на новы судовы разгляд, а прадпрымальніцу этапіраваць у камеру, дзе яна і абвясціла галадоўку. Зараз, дарэчы, у Полацку суд і разглядае "справу Бочурнай".

"Жонка кажа, што галадоўка будзе бестэрміновая, — расказаў "Народнай волі" муж Яўгеніі Бочурнай Уладзімір Журба. — Не верыць у справядлівасць судовай сістэмы. Для нас, сваякоў, пасяджэнне абвясцілі закрытым: аб'явілі сведкамі абвінавачвання і выдалілі з залы. Акрамя таго, Яўгенія Міхайлаўна кажа, што церпіць здзекі з боку канвоя і суда".

А вось калега Яўгеніі Бочурнай — прадпрымальніца Святлана Дваранінава — трымае галадоўку ў Гомельскай жаночай калоніі ўжо шосты раз. Такой акцыяй пратэсту яна патрабуе адмены свайго прысуду.

Крымінальная справа супраць яе была ўзбуджана яшчэ ў 2004 годзе. Праз два гады асудзілі на 8 гадоў зняволення за махлярства і крадзеж шляхам злоўжывання службовым становішчам (прадпрыемства не змагло ў свой час разлічыцца з пазыкамі), але пасля касацыйнай скаргі адваката жанчыне "пакінулі" шэсць з паловай гадоў калоніі.

Як бачым, справы вельмі падобныя. І прававыя сцэнарыі ў адносінах да іх — таксама. Прадпрымальніц асудзілі за тое, што яны працягвалі камерцыйную дзейнасць у той час, калі ў іх былі пазыкі.

Як напісала, апісваючы справу Дваранінавай і Бочурнай, газета "Союзное вече": "Калі ісці па шляху, якім пайшоў орган крымінальнага пераследу, то супраць вялікай колькасці кіраўнікоў арганізацый, якія "сядзяць на картатэцы", трэба ўзбуджаць крымінальныя справы за крадзеж, які яны не здзяйснялі. А на самай справе — за тое, што маюць запазычанасці. Хоць аднаўленнем эканамічнай справядлівасці павінны займацца гаспадарчыя суды".

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

P.S. *У адным з бліжэйшых нумароў мы вернемся да гэтай тэмы і падрабязней раскажам аб справах прадпрымальніц Алены Бочурнай і Святланы Дваранінавай.*

Мітрапаліт Філарэт заступаўся за Аляксандра Бароўскага

На хатні арышт прасіў змяніць меру ўтрымання для экс-кіраўніка "Белнафтахіма" Аляксандра Бароўскага мітрапаліт Філарэт.

Пра гэта стала вядома падчас агучвання на судовым працэсе некалькіх лістоў, якія розныя асобы пісалі ў справе Бароўскага, і якія былі далучаны да справы. Кіраўнік Беларускай Праваслаўнай царквы ў лісце да Аляксандра Лукашэнкі спасылаецца на зварот вернікаў з Бабруйска. Аказваецца, Аляксандр Бароўскі дапамагаў аднаўляць у горадзе старажытны храм.

Мітрапаліт Філарэт адзначыў у лісце, што, па яго звестках, Бароўскі "не зусім здаровы", таму папрасіў Лукашэнку праявіць міласэрнасць і дазволіць былому кіраўніку "Белнафтахіма" чакаць "высвятлення ўсіх абставін справы" не ў следчым ізалятары КДБ, а ў сваёй кватэры.

Аднак на меру ўтрымання Бароўскага гэты ліст, як і іншыя, не паўплываў.

Судовы працэс над былым кіраўніком "Белнафтахіма" працягваецца.

Народная Воля http://www.nv-online.info
13 САКАВІКА 2008 г.

РЭПЛІКА

Ці гатовая Беларусь да ўступлення ў Сусветную гандлёвую арганізацыю?

Беларускае тэлеграфнае агенцтва разнесла па ўсім краі радасную навіну: "Рэспубліка Беларусь вітае далучэнне Украіны да Сусветнай гандлёвай арганізацыі..."

Сёння, калі яшчэ і Расію прымуць у Сусветную гандлёвую арганізацыю, мы будзем мець 98% знешняга гандлю з сябрамі таго аб'яднання.

Здаецца, мы не надта гатовыя да такога павароту падзей. Кожная дзесятая хатняя гаспадарка мае сярэднедушавы прыбытак, ніжэйшы за пражытачны мінімум. Кожная сёмая сям'я, што гадуе дзяцей, такая ж. Засталася ў дзяржаўнай уласнасці зямля.

Ніхто не можа адмовіць тое, што нашы асноўныя рынкі збыту маюць плацежаздольны попыт на нашы тавары. Выдатна прадаецца сыравіна, выдатна прадаюцца прадукты перапрацоўкі вуглевадародаў.

Мы ствараем касмічныя спадарожнікі і стала ўваходзім у сусветную дваццатку гандляроў зброяй. Мы лідзіруем у свеце па працягласці і кошце размоў па мабільных тэлефонах. Мы маем выдатных праграмістаў і спецыялістаў ва многіх сучасных галінах вытворчасці.

Але варта прызнаць, што наш экспарт будуецца далёка не на самых сучасных тэхналогіях.

У якасці другой па значнасці крыніцы прыбытку амаль палова сем'яў называе сельскагаспадарчую дзейнасць. Сёння ў сялян на 85.000 коней болей, чым у 1991 годзе. Цяжка назваць гэта прагрэсам. Гэта дэіндустрыялізацыя.

Ды і асабліва няма чым хваліцца! За часы незалежнасці ў Мінску на 100.000 паменела прамысловых рабочых. На 10% скарацілася доля машынабудавання, на 10% -- доля лёгкай прамысловасці ў агульнай прамысловай структуры.

Мы сталі рабіць тут на трэць меней трансфарматараў, грузавікоў і тэлевізараў, значна менш трактароў і прычэпаў, утрая менш гарадскіх машын і рухавікоў, у пяць разоў менш падшыпнікаў, у 30 разоў менш матацыклаў і ў дзесяць разоў менш абутку і гадзіннікаў.

Мы не навучыліся толкам прадаваць зробленае. Мы не навучыліся рабіць яго якасным, як японскае, надзейным, як нямецкае, танным, як кітайскае. Мы нават не навучыліся рабіць яго беларускім, адметным, хаця б на сваёй мове падпісаным і сваімі словамі названым.

Ва ўмовах глабалізацыі, калі мы хочам мець рынкавую эканоміку, то трэба мець рынкі. І гэтыя рынкі не даюцца проста так. За іх трэба канкурыраваць. А дзеля канкурэнцыі на крок апярэджваць астатніх. Па-першае, у адукацыі. Па-другое, у навуцы. Па-трэцяе, у самых сучасных вытворчасцях.

А мы на рубель экспартнай прадукцыі трацім энергіі ў паўтара раза больш за палякаў, утрая больш за немцаў.

З усяго сказанага вынікаюць два магчымыя варыянты развіцця. Можна пакінуць усё як ёсць, дачакацца, калі энергарэсурсы зробяцца нам наогул не па кішэні. Зачыніць заводскія брамы і рушыць альбо наймацца за мяжу, альбо ў вёску, у батракі да тых, хто загадзя паклапаціўся купіць коней. І будзе тут цуд некранутай прыроды.

А можна інакш. Толькі трэба, каб заводы атрымалі сучасныя веды і тэхналогіі, сучасныя сістэмы кіравання вытворчасцю і таваправодныя сеткі, каб мелі доступ да рынкаў збыту. Навучыцца рабіць, як робяць людзі ў еўрапейскіх краінах.

А пакуль што мы робім найлепей за ўсіх: маўчым і чакаем?

Юзік ЛАБЭЦКІ, эканаміст-футуролаг.

ЧУЛІ?

У Салігорску будзе вуліца Быкава

З прапановай надаць адной з вуліц Салігорска імя славутага беларускага пісьменніка да раённай адміністрацыі звярнуўся незалежны прафсаюз гарнякоў.

У адказе за подпісам старшыні салігорскага райвыканкама Аляксандра Рамашэўскага паведамляецца, што ў Салігорску плануецца пабудаваць новы мікрараён, і "адна з вуліц у гэтым мікрараёне можа быць названая ў гонар Васіля Быкава". Пра гэта паведаміла мясцовая газета "Інфа-кур'ер".

КДБ шукае сляды РНЕ

Упраўленне КДБ Віцебскай вобласці зацікавілася лістамі з пагрозамі ад віцебскага "Русского национального единства".

"Апошнім часам такія пагрозы ў адрас мясцовых актывістаў сталі "добрай традыцыяй", — паведаміла сябра Аб'яднанай грамадзянскай партыі Алена Залеская. — Такія лісты прыходзілі рэдактару незарэгістраванага выдання "Кур'ер з Віцебска" Уладзіміру Базану, распаўсюджвальніку незалежнай прэсы Барысу Хамайдзе, членам КХП—БНФ... Усяго семярым актывістам. Звароты апошніх у пракуратуру не мелі абсалютна ніякага рэзанансу. Два гады таму я нават сама пісала скаргу ў КДБ, пасля чаго мне прыйшоў адказ: маўляў, такая арганізацыя, як РНЕ, у Мінюсце не зарэгістравана, асобаў, якія маюць прыналежнасць да РНЕ, таксама не выяўлена. Зараз, наколькі вядома, супрацоўнікі КДБ па Віцебскай вобласці распачалі такі следства па даручэнні рэспубліканскай пракуратуры, у якую са скаргай на дзеянні РНЕ звярнуўся кіраўнік Саюза беларускіх яўрэйскіх арганізацый Леанід Левін".

Несколько слов о полной чепухе

Сергей НИКОЛЮК, *политолог, эксперт Партии БНФ.*

В Беларуси власть заговорила о либерализации. "Разговорчики в строю" на эту тему уже раздавались в ходе вторых президентских выборов, но выборы прошли, "разговорчики" стихли, и взамен либерализации обществу была предложена государственная идеология. А что еще могла предложить родная власть? Когда разумная пропорция хлеба и зрелища нарушается, волей-неволей приходится налегать на зрелище, пусть и в идеологической упаковке.

В марте 2003 года рейтинг "батьки", если верить социологам, опустился до рекордно низкого уровня (26—27%). Казалось, ничто уже не в силах остановить его дальнейшее падение. Но ожидания оппозиционных оптимистов не сбылись. На мировых рынках начала дорожать нефть. Белорусские государственные умельцы, воспользовавшись беспошлинной поставкой российской нефти, открыли "нефтяной оффшор". Пересохший было ручей социальных программ вновь пополнился, и рейтинг главного начальника пополз вверх. Так продолжалось до конца 2006 года.

Прошлогодний кризис в белорусско-российских отношениях не на шутку перепугал соотечественников. Нарастающая весь год неуверенность, подкрепленная ростом цен в ноябре-декабре, легко переформатировалась в шок, который моментально отразился на вышеупомянутом рейтинге. Он, подобно биржевому курсу акций уличенной в сомнительных операциях компании, стал падать.

Отсюда — второе пришествие либерализации. Судя по всему, на этот раз оно не сведется к одним лишь обещаниям. Перед чиновниками поставлена конкретная задача — войти в ближайшие годы в число 25 стран по качеству делового климата. Это вам не АЭС построить. Ни чужие кредиты, ни чужие советы в этом деле принципиально помочь не смогут. Требуется собственный кропотливый труд и не только "вертикальщиков", а всего общества.

Из западного далека усилия белорусского правительства стали уже заметны. Так, советник по юридическим вопросам Международной финансовой корпорации Валерий Фадеев в ходе недавнего брифинга выразил полную уверенность в том, что *"реформы будут продолжены"*. Свой оптимизм он объяснил решительным отказом правительства действовать в рамках известного принципа *"шаг вперед — два шага назад"* и его готовностью сконцентрироваться исключительно на *"движении вперед"*.

Свои замечательные выводы господин Фадеев обнародовал в конце января. Не знаю, поубавилось ли у него с тех пор оптимизма, но 12 февраля автор *"белорусской экономической модели"* в ходе своего выступления перед студентами БГУ был весьма решителен в отстаивании незыблемости знакомых до боли экономических догм. По его словам, Беларусь не только продолжает занимать достойное положение в мировом сообществе, но она еще и заставляет экспертов разных стран мира с возрастающим интересом и завистью говорить об *"особой, белорусской модели социально-экономического развития"*.

Достоинства модели не держатся в секрете. Согласно последней публичной версии, они сводятся к пяти пунктам:

— во-первых, это социально ориентированная рыночная экономика;

— во-вторых, отказ от шоковых реформ;

— в-третьих, формирование эффективной системы управления — вертикали власти;

— в-четвертых, активная организующая и регулирующая роль государства во всех социально-экономических процессах;

— в-пятых, сотрудничество с Россией и странами — членами СНГ.

Остановимся отдельно на четвертом достоинстве. В свое время А.Г. объяснил необходимость всепроникающего государственного контроля своей личной любознательностью ("Меня интересует все"). Но сегодня, когда в условиях разворачивающегося кризиса чрезмерная цена такой любознательности для общества становится очевидной, личный интерес ко всему приходится урезать. Процитирую: *"Там, где мы можем управлять, там и будем управлять, вникать, и ни в коем случае не будем приватизировать то, что сегодня хорошо работает и приносит результаты. Придет время, приватизируем"*.

Интересная получилась картина, согласитесь. Государство управляет конкретным предприятием до тех пор, пока *"хорошо работает и приносит результаты"*, но как только оно доводится до ручки, то объявляется, что *"время пришло"*, после чего выдается разрешение на его приватизацию.

За последние годы в Беларуси "время пришло" не только для обширного перечня предприятий, но и для целых отраслей, в частности, для сельского хозяйства. Согласно официальным данным Министерства финансов, из бюджета на поддержку АПК в текущем году будет выделено 9,5 триллиона рублей, а выручка отечественных сельхозпроизводителей за весь прошлый год составила 6,9 триллиона.

Так что налетайте — подешевело! Сегодня собственным колхозом вместе с колхозниками можно обзавестись в Беларуси за одну базовую величину. Но, решившись оформить столь выгодную приватизационную сделку, не забудьте прихватить с собой чемодан с деньгами. Они потребуются вам для погашения накопившихся долгов. Долги эти перед государством, и создало их государство, когда, удовлетворяя свое любопытство, оно решило, что *"может управлять"*.

Приватизационные послабления породили волну комментариев по поводу возможного перерастания либерализации экономической в либерализацию политическую. Частным собственником, мол, так просто не покомандуешь. А потому трансформация государственного экономического базиса в частный непременно приведет и к трансформации надстройки. Такая вот логика.

Для сторонников марксистского взгляда на современную белорусскую реальность у А.Лукашенко давно уже припасен надлежащий ответ. Напомню его: *"Чепуха полная. С частником разговаривать всегда легче. Ему сказал — он сделает. Потому что по большому счету рискует в противном случае потерять свою собственность. Простите меня за нескромность, я же неглупый человек, я это понимаю"*.

Предлагаю всем читателям "Народной воли" серьезно отнестись к совету неглупого человека и понять то, что ему было ясно изначально. К понятию *"частная собственность"* в Беларуси следует подходить крайне осторожно. Да, на бумаге она присутствует. Может она присутствовать и на деле, но лишь при условии полной политической лояльности владельца. Ничего нового в этом нет. Точно так же, как сегодня государство раздает колхозы вместе с колхозниками, а заводы и фабрики вместе с персоналом, царь Петр Алексеевич раздавал новоявленному классу промышленников земли и крестьян.

Соединяя царские дары со своими личными предпринимательскими талантами, Демидовы и их менее известные коллеги создавали предприятия, но владельцами предприятий они не являлись. Они ими владели на условиях службы первому лицу государства. *"Пока служу — владею"* такова формула служебной собственности. Современные предприниматели, не сумевшие данную формулу своевременно усвоить, вынуждены либо жить за границей, подобно белорусу Пупейко, либо *"отдыхать"* на нарах, как россиянин Ходорковский.

Но не следует наивно полагать, что принцип служебной собственности распространяется исключительно на предпринимателей. Для иллюстрации ошибочности подобных взглядов напомню о проблеме, с которой недавно столкнулись жильцы ряда домов, что по улице К.Маркса в Минске. Приватизируя в свое время квартиры или покупая их через агентства, они свято верили в свое законное право владеть и распоряжаться недвижимостью. Они и не предполагали, что станут подписантами коллективных жалоб в многочисленные инстанции, включая самую высшую, расположенную, кстати, на той же улице. Вот уж ирония судьбы. Куда тут Рязанову с его талантом!

Вы спросите, почему они пишут жалобы, а не обращаются в суд? Хороший вопрос, но вот как дать на него хороший ответ? Возможно, за помощью следует обратиться к сотням партийных активистов, осужденных судами за мелкое хулиганство. А возможно, следует обратиться к историческому опыту. В свое время граждане получали блага из монарших рук в результате пожалования, поэтому желающим приобрести надел или должность следовало жаловаться, что они и делали.

Тот, кто жалуется, — благонадежен. С ними власть играет по одним правилам. Для неблагонадежных же граждан существует "самый гуманный суд в мире". Для не почувствовавших разницу я в очередной раз сошлюсь на слова самого высокого начальника: *"Потому что как только вы переступите грань и от экономических требований — своих требований! — перейдете на поле политики, диалог с вами будет вестись по законам политики, а не экономики"*.

На политическом поле Беларуси, согласно официальной версии, нет оппозиции. На политическом поле Беларуси, согласно официальной версии, есть только *"так называемая оппозиция"*. Вот и пишут жители столичной улицы имени К.Маркса с несчастливыми номерами домов жалобы. Они боятся перейти ту узкую грань, которая разделяет в нашей стране жителей и "так называемых жителей". Они надеются, что так у них есть хоть какой-то шанс сохранить свое *"служебное"* имущество. Но, судя по утечкам информации из городских структур, число подобных наивных жалобщиков будет возрастать и возрастать довольно быстрыми темпами.

Посевная началась

Хозяйства южных районов Брестской области первыми в Беларуси начали сев овса и другие весенне-полевые работы.

Об этом сообщил начальник главного управления растениеводства Министерства сельского хозяйства и продовольствия **Григорий РОМАНЮК**.

По его словам, к такому раннему севу здесь приступили для того, чтобы не упустить влагу в почве, так как к середине марта синоптики обещают повышение дневных температур до плюс 12 градусов. К этому времени почва достигнет физической спелости, и можно будет сеять и другие культуры. Следом за овсом сельчане будут сеять ячмень.

В настоящее время хозяйства республики вносят минеральные и органические удобрения, готовят почву к севу, протравливают семена, то есть проводят необходимый технологический цикл работ, который предусмотрен агротехникой в этот период.

На этой неделе к севу приступят хозяйства Гомельской и некоторых районов Минской областей.

ІНІЦЫЯТЫВА

АЭС: за і супраць

Група беларускіх вучоных прапаноўвае стварыць камісію па ацэнцы мэтазгоднасці развіцця ў краіне атамнай энергетыкі. Пра гэта было заяўлена на "круглым стале", прысвечаным стварэнню ініцыятывы "За бяз'ядзерную Беларусь".

Прафесар Георгій Лепін праінфармаваў, што такая камісія была створана распараджэннем прэм'ер-міністра ў 1998 годзе. Паводле яго слоў, яна павінна была *"прааналізаваць і ацаніць прымяняльна да Беларусі звесткі аб развіцці сусветнай атамнай энергетыкі, альтэрнатыўныя варыянты забеспячэння рэспублікі паліўна-энергетычнымі рэсурсамі, што базіруюцца на рацыянальным іх выкарыстанні, прымяненні сучасных парагазавых тэхналогій і нетрадыцыйных крыніц энергіі"*.

Адно з важных рашэнняў, на думку вучонага, якое ўдалося ў той час прыняць, — гэта прыпыненне на 10 гадоў работ у галіне атамнай энергетыкі ў Беларусі. Аднак тэрмін мараторыя заканчваецца 1 студзеня 2009 года, таму "было б разумна", на думку Г.Лепіна, стварыць камісію, якая *"падвядзе вынікі ўсёй працы ў гэтым кірунку за 10 гадоў"*.

Так, напрыклад, у заключэнні дзейнай камісіі было сказана, што неабходна вывучаць сусветны вопыт у атамнай энергетыцы. *"У сваіх заявах прыхільнікі будаўніцтва АЭС пішуць, што ва ўсім свеце актыўна будуюць АЭС. Аднак сусветны вопыт развіцця атамнай энергетыкі паказвае зваротнае: за апошнія гады будаўніцтва атамных станцый фактычна было згорнута ва ўсіх краінах, апрача краін, якія развіваюцца і якія актыўна рвуцца да атамнай зброі"*, — лічыць вучоны.

Паводле яго слоў, у Германіі скарочана колькасць ужо працуючых АЭС з 20 да 17. *"У ЗША з 1978 года ніводная АЭС не пабудавана, там толькі спрабуюць падоўжыць тэрмін эксплуатацыі з 30 да 50 гадоў. У Францыі, дзе найбольшая шчыльнасць АЭС, вырашана будаваць толькі ў тым выпадку, калі нейкая станцыя выводзіцца з эксплуатацыі"*, — сказаў Г.Лепін.

Не вывучана пытанне па захаванні радыеактыўных адходаў і вывадзе АЭС з эксплуатацыі. *"Тут наогул сусветнага вопыту няма, паколькі адсутнічаюць тэхналогіі"*, — падкрэсліў вучоны. Паводле яго слоў, калі 10 гадоў таму вывядзенне з эксплуатацыі АЭС каштавала 10% ад кошту станцыі, то цяпер гэта сувымерна з затратамі на само будаўніцтва станцыі.

На думку Г.Лепіна, ніхто таксама не пралічваў, колькі будуць каштаваць з уводам атамных энергаблокаў структурныя змяненні ў беларускай энергасістэме.

Наталля КАРОТКАЯ.

Алена БОНЭР:

«Аўтарытарызм — гэта надоўга»

Вядомыя расійскія грамадскія дзеячы падпісалі дарадчыя лісты для намінацыі старшыні Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) Аляксандра Казуліна на прэмію Андрэя Сахарава, якая штогод прысуджаецца Еўрапейскім парламентам.

Сярод падпісантаў — Алена Бонэр, удава акадэміка Сахарава і старшыня фонду ягонага імя. Беларускія журналісты знайшлі яе ў Боне.

— Алена Георгіеўна, чаму вы падпісалі зварот у Еўрапарламент?

— Таму, што чалавек паважаны.

— Як вы лічыце, хто яшчэ з беларускіх апазіцыянераў заслугоўвае міжнароднага прызнання?

— Усе заслугоўваюць. Тыя прозвішчы, якія я ведаю... Мне падаецца, усе прыстойныя людзі.

— Такія прэміі — гэта толькі фінансавая падтрымка пацярпелых, ці ўсё ж такі крок да дэмакратыі ў краіне?

— Лічу, што фінансавая падтрымка пацярпелых — гэта толькі ў другую чаргу. У першую — зварот увагі грамадства да той дзейнасці, якая выклікае высокую павагу і захапленне заходніх садружнасцяў.

— Ці не дарэмныя ўсе гэтыя ахвяры, калі на працягу столькіх гадоў большасць выбірае дыктатуру?

— Па-першае, змаганне з дыктатурай цягнецца яшчэ не так шмат часу. А па-другое, нішто не бывае дарэмным.

— Вы дапускаеце, што ў Расіі хутка будуць саджаць у турмы за тое ж, за што саджаюць няўгодных у Беларусі?

— Вядома ж! Я ўвогуле не лічу, што ў Беларусі з выкананнем правоў чалавека горш, чымсьці ў Расіі. І я заўжды не разумела, чаму Захад успрымае Лукашэнку як крайне негатыўнага лідэра, а расійскага прэзідэнта так не ўспрымаюць. Лукашэнка — персона нон-грата. А памойму, гэта Пуцін варты такога тытулу... Адзінае тлумачэнне: Захад баіцца моцнай дзяржавы. А Беларусь... У яе ні нафты, ні газу. А між іншым, гэта тая ж Беларусь, якая падчас Вялікай Айчыннай сваім целам Расію прыкрыла.

— Аўтарытарны рэжым у Расіі — гэта надоўга?

— Надоўга! Вельмі надоўга!

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ...

Свабода — без «Пагоні»

Я абураны. Нядаўна зазірнуў на сайт Радыё Свабода і сам сабе не паверыў. У сайта новы дызайн, у якім знік беларускі герб "Пагоня". Можа, гэта нейкі тэхнічны збой?

Іван Яльцоў, г.Бабруйск.

На жаль, гэта не збой. Амаль дзесяць год "Пагоня" была на сайце Радыё Свабода, нягледзячы на тое, што сайт мяняў дызайн неаднойчы. Але зараз прынята іншае рашэнне.

Выконваючы абавязкі дырэктара беларускай службы Ян Максімюк патлумачыў: "Летась адкрылі новую старонку — і з гэтым звязана жорсткая рэгламентацыя. То бок усе нацыянальныя службы Радыё Свабода абавязаны мець адзіны дызайн, на якім змяшчаецца толькі лагатып радыёстанцыі. Справа ва уніфікацыі — і ні ў чым больш".

УВАГА!

За градкамі не забудзьцеся аформіць дом

Да кастрычніка садаводам трэба зарэгістраваць правы на ўчасткі ў таварыствах і кааператывах. Зрабіць гэта трэба абавязкова, інакш загарадную ўласнасць можна страціць.

Працэдура рэгістрацыі — працэс мудрагелісты. Напісанне заявы, зварот па даведку да старшыні таварыства, затым у райвыканкам, потым "Белгіпразем", дзе за 2 месяцы падрыхтуюць землеўпарадкавальную справу — за яе прыйдзецца выкласці дзесьці 140 тысяч рублёў, затым у абласное агенцтва па дзяржрэгістрацыі і зямельным кадастры. Гэта ўжо апошняя інстанцыя. І сюды можна прыйсці нават без дакументаў. Пашпарт, заява, — у астатнім, па жаданні кліента, усе неабходныя паперы будзе шукаць ужо агенцтва. Кошт афармлення зямлі будзе не менш за 31 і не больш за 35 тысяч рублёў. Але калі на ўчастку ёсць дом — даражэй, бо прыйдзецца аформіць яшчэ і тэхпашпарт на будынак. Ужо падлічана, што дачная рэзідэнцыя плошчай 50 квадратных метраў абыдзецца ў месяц чакання і 105 тысяч рублёў.

Па самых сціплых падліках (калі ўзаконьваюцца і дом, і ўчастак), на ўсё пра ўсё можа спатрэбіцца 2—3 месяцы. Таму землеўпарадкавальнікі рэкамендуюць дачнікам паспяшацца.

ПРАЦЯГ ТЭМЫ

Польшча дала беларускаму хлопчыку сваё грамадзянства

Народжаны ў Польшчы сын беларускі Павел Іваноў, ад якога маці адмовілася амаль адразу пасля яго нараджэння ў красавіку 2007 года, застаецца грамадзянінам Беларусі. Пра гэта заявіў прэс-сакратар пасольства Беларусі ў Варшаве Дзмітрый Выбарны.

Нагадаем, што не так даўно мы расказалі пра сітуацыю, калі дзве краіны — Беларусь і Польшча — спрачаюцца за дзіця. Артыкул называўся "Ці ты Ясь, ці ты не?". Ён вельмі зацікавіў нашых чытачоў, і ў рэдакцыю паступіла шмат тэлефонных званкоў з просьбай расказаць, як развіваюцца падзеі.

Дзмітрый Выбарны падкрэслівае, што пасольства і консульства Рэспублікі Беларусь у Польшчы займаліся лёсам Паўла Іванова ўвесь гэты час. "Мы зыходзілі з таго, што дзіця — грамадзянін Беларусі і павінна знаходзіцца ў сваёй краіне", — сказаў ён. Прэс-сакратар пасольства таксама зазначыў, што генконсул Беларусі ў Гданьску Руслан Есін сістэматычна наведвае дзіця, якое да апошняга часу знаходзілася ў гэтым горадзе. Хлопчыка наведваў і пасол Беларусі ў Польшчы Павел Латушка, які таксама меў размову ў МЗС Польшчы наконт лёсу дзіцяці.

Між тым польскія СМІ распаўсюдзілі інфармацыю аб тым, што бацькам дзіцяці прызнаў сябе грамадзянін Польшчы, і Павел Іваноў (польскія СМІ называюць хлопчыка Ясем) атрымаў польскае грамадзянства. Пры гэтым яго бацька ад выхавання хлопчыка адмаўляецца.

Каментуючы гэтыя падзеі, Д.Выбарны сказаў: "Пасольства Беларусі ў Польшчы не атрымала афіцыйнага паведамлення аб тым, што Павел Іваноў атрымаў грамадзянства Польшчы. У выпадку, калі гэта сапраўды так, хлопчык па-ранейшаму застаецца грамадзянінам Беларусі і адначасова грамадзянінам Польшчы. Пасля дасягнення ім 16-гадовага ўзросту ён зможа выбраць адно з двух грамадзянстваў".

"Звяртае на сябе ўвагу той факт, што польскі бок несвоечасова праінфармаваў беларускі бок аб гэтым дзіцяці, — заявіў прадстаўнік пасольства. — Вельмі шкада таксама, што польскія СМІ выкарысталі гэты выпадак для неабгрунтаванай крытыкі нашай краіны і сцвярджэнняў, што ў Беларусі дзіця не атрымае кваліфікаванай медыцынскай дапамогі". Паводле даных Міністэрства аховы здароўя, зазначыў Д.Выбарны, у Беларусі ёсць вопыт лячэння мукавісцыдозу, неабходныя для гэтага прэпараты і сучаснае абсталяванне.

Алена СПАСЮК.

Народная Воля http://www.nv-online.info
13 САКАВІКА 2008 г.

ДАКОР

А цяпер — адны развалiны

На плошчы Леніна ў Слоніме шмат гадоў кідаюцца ў вочы развалiны старога будынка. Тут ужо цягам 18 гадоў плануюць пачаць будаўніцтва Слонімскага драматычнага тэатра, але ніяк не пачнуць.

На пачатку XX стагоддзя тут месціўся Народны дом, пасля апошняй вайны — Дом культуры. У свой час у ім праходзілі розныя культурныя мерапрыемствы, сустрэчы, фэсты, канцэрты. Выступалі не толькі мясцовыя народныя таленты, а і прафесійныя артысты. Нават цяжка ўявіць, што ў іх ліку былі такія вялікія і знакамітыя, як сам Фёдар Шаляпін (1873—1938) ці польскі оперны спявак Ян Кепура (1902—1966), польская танцорка, артыстка і харэограф Лода Халама (1911—1996), яўрэйскі вандроўны тэатр...

Ацалеў Народны дом і пры немцах. Нават падчас вайны ў ім працаваў беларускі драматычны гурток (кіраўнік Чуркін), ладзіліся выставы слонімскіх мастакоў і майстроў народнага мастацтва, адбываліся розныя музычныя і літаратурныя вечары. Са сваімі вершамі выступалі слынная беларуская паэтка Наталля Арсеннева, паэты Гальяш Леўчык, Сяргей Хмара, Сяргей Новік-Пяюн, спяваў Міхась Забэйда-Суміцкі. Кампазітар Антон Валынчык арганізаваў беларускі хор, быў і танцавальны гурток пад кіраўніцтвам прафесіянальнай танцоўшчыцы Шышкінай. Маладыя драмгурткоўцы па прапанове Новіка-Пеюна, які апекаваўся слонімскім музеем, паставілі "Мікітаў лапаць" М.Чарота, п'есу "Дзядзька Якуб" Ф.Аляхновіча...

Пра ўсё гэта распавёў наш зямляк Барыс Данілюк, які зараз жыве ў ЗША.

Пасля вайны Беларускі народны дом стаў раённым Домам культуры. Пачаў працаваць новы драмгурток, які ўзначальваў Аляксандр Бялоў, пазней ён стаў заслужаным артыстам Беларусі. Тэатр атрымаў ганаровае званне народнага, а калі ў 1968 годзе рэжысёрскую эстафету прыняў таленавіты энтузіяст Мікалай Варвашэвіч, колішні аматарскі гурток стаў Слонімскім беларускім драматычным тэатрам.

Акрамя таго, адораныя самародкі захоплена працавалі ў аркестры народных інструментаў (кіраўнік Марат Малікаў), удзельнічалі ў рабоце мясцовай кінастудыі ў іншых творчых калектывах.

...Неяк на аўтобусным прыпынку да мяне падышла сланімчанка Леаніда Міхайлаўна Цапко, спытала: "Ці ведаеце, што ў нашым Народным доме некалі выступала сусветна вядомая спявачка Галіна Вішнеўская?" Я ведаў, што да нашых землякоў нярэдка наведваліся вядомыя артысты — рускія, украінскія, малдаўскія, літоўскія і г.д. Леаніда Міхайлаўна працягвала: "Мне тады было 12 гадоў. Я несла з рынка яйкі ў сетцы і, махаючы ёй, разбіла іх, бо засяродзілася на чытанні прыгожай афішы. Вялікімі літарамі было напісана, што ў Слоніме выступяць артысты Ленінградскай філармоніі, і сярод іх Галіна Вішнеўская. На афішы быў прыгожы партрэт артысткі, падобнай на цыганку... Але самой трапіць на канцэрт не выпала — там была дарослая публіка, у бальшыні ваенныя і іх жонкі..."

У 1981 годзе Слонімскі РДК пераехаў у новае памяшканне на Чырвонаармейскую вуліцу, а дзверы старога будынка зачынілі на замок. З гадамі без гаспадароў былы Народны дом пачаў прыходзіць у заняпад, цяпер ад яго засталіся толькі сцены. Але, калі б сцены маглі размаўляць, яны расказалі б нам цікавую гісторыю пра культурнае жыццё Слоніма і пра тых творцаў, якіх яны ў свой час слухалі і бачылі, чые галасы яшчэ гучаць у душах людзей, каго колішні культурны цэнтр далучыў да мастацтва.



Сяргей ЧЫГРЫН.

На здымках: *так выглядаў Народны дом у Слоніме ў 1970-х гадах (верхні здымак). Так выглядае дом цяпер.*

Суворову не место на белорусской земле

Очень интересная и полезная рубрика "Если бы я был президентом…". По моему мнению, есть над чем серьезно задуматься не только рядовым гражданам, но и тем, кто находится в руководстве страны.

Считаю, что президент любого государства обязан знать и помнить историю своей страны и относиться к ней с большим уважением. Ведь, не уважая историю страны, как можно относиться с уважением к ее народу?

Зная, какую роль в истории нашей многострадальной Беларуси сыграл русский полководец Александр Суворов, который в 1794 году на белорусских землях действовал не как простой военачальник, а как российский военный каратель, душитель свободы, потопивший в крови освободительное восстание Тадеуша Костюшко, помня, что по его приказам расстреливали мирных повстанцев, сжигали деревни, население которых поддерживало этих национальных героев, и что за эти "заслуги" перед Россией царскому генералу-сатрапу Суворову императрица Екатерина II пожаловала чин фельдмаршала, присовокупив в качестве подарка Кобринскую волость и другие белорусские земли с проживающими на них почти 50 тысячами белорусских крестьян в качестве крепостных. Я, если бы был президентом, незамедлительно убрал бы своим указом всякое упоминание фамилии Суворова в качестве увековечивания этого палача на территории страны.

Закрыл бы в Кобрине военно-исторический музей Суворова, а все его экспонаты подарил бы России, для которой они действительно представляют историческую ценность.

Переименовал бы Минское суворовское военное училище в кадетское военное училище.

Не сомневаюсь, что такими своими действиями я как президент Беларуси получил бы полное одобрение со стороны соотечественников — патриотов нашей любимой страны, и даже не обидел бы российский народ, который бы все правильно понял и оценил. Ведь если ты сам к себе относишься с уважением как к личности, то и к тебе будут люди всегда относиться с уважением. Сказанное в полной мере относится и к народу в целом. То есть я хочу сказать, что не уважающий себя народ не заслуживает никакого уважения со стороны других. Это общеизвестная истина.

Леонид Георгиевич ЗУБОВИЧ, житель г.Могилева, пенсионер.

P.S. *Слава Богу, что у нас не увековечен царский генерал-вешатель Муравьев, жестоко подавивший в 1863 году национально-освободительное восстание Кастуся Калиновского. Для белорусского народа оба этих царских карателя — и Суворов, и Муравьев — "одного поля ягоды", лица, не достойные нашей национальной памяти.*

КОЛОНКА ЮРИСТА

На вопросы читателей "Народной воли" отвечает юрист Олег Волчек

Членство в профсоюзе значения не имеет

Я работаю на предприятии пять лет. Недавно меня незаслуженно наказали — лишили премии и объявили выговор. Хочу обжаловать эти действия в комиссию по трудовым спорам, но членом профсоюза я не являюсь. Могу ли я обратиться в КТС?

Смирнов В.А., г.Пинск.

Вы можете обратиться в комиссию по трудовым спорам. Скажу больше: вы находитесь в более выгодном положении, чем члены профсоюза. Согласно трудовому законодательству, вы имеете право выбора: обратиться в КТС или непосредственно в суд, минуя КТС.

Лишить родительских прав может комиссия

До недавнего времени я была в браке. Брак не первый, и официально мы его не оформляли. В настоящее время я встречаюсь с другим мужчиной. Моей матери не нравятся наши взаимоотношения. Мать заявила, что лишит меня родительских прав, раз я не работаю и живу с разными мужчинами. Но я считаю, что мать на это права не имеет. Так ли это?

Гусейнова В.А., г.Сморгонь.

В настоящее время законодательство в плане защиты детей изменилось. И если ваша мать докажет, что Вы ведете образ жизни, который плохо влияет на Вашего ребенка, она может обратиться в соответствующие органы, и уже комиссия будет решать судьбу Вашего ребенка и Вас.

Работники милиции нарушили несколько уголовных статей

В то время, пока я была на работе, мою несовершеннолетнюю дочь допросили работники милиции. Это было в моей квартире, никто из взрослых, кроме работников милиции, не присутствовал. Они изложили ей факты моей личной жизни, о которых я свою дочь в известность не ставила. Можно ли привлечь работников милиции к ответственности за подобные действия.

Корабельникова В.Л., г.Брест.

В данном случае действия работников милиции подпадают сразу под несколько статей Уголовного кодекса. Во-первых, они не имели права допрашивать Вашу несовершеннолетнюю дочь в Ваше отсутствие. Такой допрос должен проводиться с участием педагога и родителя ребенка. Во-вторых, под уголовно наказуемое деяние подпадает то, что они разгласили сведения, касающиеся Вашей личной жизни. При желании можно возбудить дело в отношении следователя по ст.424 УК РБ (злоупотребление служебными полномочиями) и по ст. 407 УК РБ (умышленное разглашение данных предварительного следствия лицом, имеющим доступ к материалам уголовного дела по службе). Вам надо обратиться в районную прокуратуру с заявлением о возбуждении уголовного дела.

Дачу надо приватизировать, а потом дарить

У моей матери есть дача в дачном товариществе. Участок размером 6 соток выделялся под занятие садово-огородной деятельностью с правом застройки садового домика. Сейчас мама решила подарить этот домик и участок мне. Но в райисполкоме ей отказывают в переоформлении документов. Ссылаются на то, что дом не приватизирован. Могут ли они отказать в оформлении документов.

Петровский А.П., Минская область.

Исходя из изложенной Вами ситуации, и участок в садовом товариществе, и дачный домик не оформлены Вашей мамой в собственность. Так как она не может предоставить документов, удостоверяющих ее права собственности на данное недвижимое имущество, то орган, регистрирующий совершение сделок, абсолютно законно отказывает ей в переоформлении данного имущества. Для того чтобы иметь право на передачу данного имущества Вам, ей необходимо оформить право собственности на имущество на свое имя, а уже затем распоряжаться им по своему усмотрению.

БОЛЬ

З цяжкім сэрцам пайшла маці ў іншы свет

Сорак дзён мінула як мая матуля пакінула гэты свет. А дванаццатага студзеня яна завяршала дзевяты дзесятак. На свой дзень народзінаў паклікала ўсю радзіну. Ёй ужо нядобрылася, і калі-нікалі нават забірала мову. Але яна трымалася, была рухавая, сама гатавала ежу. Напісала мне: "Валодзя, я не хворая! Прыязджайце ўсе!"

Якраз у тыя дні ліквідавалі льготы пенсіянерам. У маёй дзевяностагадовай матулі — таксама. Не скажу, што яна так ужо бедавала з гэтага, але была засмучана. Разважала: "Неяк жа перажыву, неяк выкручуся. А вось з лекамі будзе цяжка. Крыўдна. Усё жыццё мы так цяжка жылі, цяжка працавалі". І ўзгадвала: рабіла на ферме, дык да вясны не хапала кармоў. Каровы падалі на ногі, прымярзалі да гною. Падымалі іх на вяроўках, цягнулі, як маглі, ратавалі. А што мелі за тое?

Са сваім чалавекам пражыла ўсяго нейкія чатыры гады. Тут вайна... Ваш тата ў першыя дні вайны склаў галаву. Адна гадавала вас, на ногі ставіла... А цябе, Валодзя, параніла... Пасля вайны зноў гора: не было ні хаты, ні лапаты. Усё сама, усюды адна. І вось дажылася, што з мяне, дзевяностагадовай, лекі льготныя знялі. Хай бы мяне ўжо Бог да сябе забраў!.."

Я супакойваў матулю: "Не бядуй!.. Не пакіну цябе. У мяне ж, інваліда з маленства, ільготныя лекі захаваліся. Будзем неяк дзяліцца". У нас з матуляй былі агульныя захворванні на сэрца, гіпертэнзія.)

Дактары мелі надзею, што ёй стане лепей, суцяшалі мяне яшчэ напярэдадні незваротнай бяды. На восьмы ж дзень свайго дзевяностагоддзя яна памерла ў Бараўлянскай раённай бальніцы.

Зразумела, гады робяць сваё, і ніхто не жыве вечна. Ды ўсё ж... Недарэчнасці, трывогі нашага жыцця, як сама яна прызнавалася, чаплялі яе за жывое. Хаця чаго там: маці і ў бальнічнай каталцы за колькі гадзін да свайго скону глядзелася велічна і нават уладарна!

Між іншым, матуля мела дзяржаўную ўзнагароду — медаль "За доблестный труд в годы Отечественной войны 1941—1945 гг. Здаецца, гэтага было дастаткова, каб за ёй і за такімі, як яна, пакінулі льготы хаця б на лекі, з павагі да людзей, хто сваёй самаахвярнай працай набліжаў наш Дзень Перамогі.

Пра павагу і клопат аб старэйшым пакаленні надта любяць — і, трэба аддаць належнае, умеюць прыгожа гаварыць кіраўнікі ўсіх рангаў. На жаль, нярэдка — толькі гаварыць... Таму і пайшла з жыцця мая матуля з цяжкім сэрцам.

Уладзімір СОДАЛЬ-САДАЛЬСКІ, пісьменнік.

РУБАМ!

Чаму ў Беларусі амаль няма людзей сярэдняга класа?

Што ж гэта, людцы, робіцца? Такога расслаення насельніцтва, як сёння, Беларусь не ведала нават у савецкія часы. Тагачасныя першыя сакратары райкамаў ці нават абкамаў партыі ў параўнанні з цяперашнімі алігархамі — галота. Жылі лідэры камуністаў, асабліва ў райцэнтрах, не ў казачных катэджах, іх тады зусім не было, а ў звычайных дамах ці кватэрах, скажам, на другім ці трэцім паверсе. Глядзіш, на адной пляцоўцы і партбос, і рабочы райпрамкамбіната, і школьная бібліятэкарка. А на якіх машынах гойсалі райкамаўцы па калгасах і саўгасах? На "газіках", а потым на "уазіках". Ды сённяшнія ўладальнікі вялікіх грошай нават і не зірнулі б на іх — паглядзіце, колькі самых дарагіх іншамарак, адно запасное калясо якіх цягне ледзь не на тысячу баксаў, круцяцца па вуліцах.

Не, я абсалютна не супраць таго, каб багацелі людзі. Але вось, людцы, пытанне: чаму багатыя становяцца яшчэ больш багатымі, а бедныя — яшчэ больш беднымі? Ці ж можна параўнаць рабочага завода савецкіх часоў з сённяшнім заводскім рабочым? Памятаеце перыяд, калі разгарнулася кааператыўнае будаўніцтва жылля? Які ажыятаж быў! Таму што ледзь не кожная рабочая сям'я мела грошы на будаўніцтва кватэры. А сёння мае такія грошы, скажам, рабочы таго ж трактарнага завода? Не, не мае. Затое тыя, каго народ ахрысціў алігархамі, вунь якія гмахі ўзводзяць — коштам у мільён, а можа, і болей долараў.

Я не вучоны, але разумею, што не ўсё нармальна ў той дзяржаве, у якой адбываецца такое расслаенне грамадства. У нас, можна сказаць, наогул няма сярэдняга класа. Той жа рабочы завода ці фабрыкі па сутнасці бліжэй да бедняка, чым да заможнага, з нармальным дастаткам чалавека. Пабудаваць кватэру з сучаснай планіроўкай ён не можа, набыць новую машыну — ні ў якім разе, як і з'ездзіць на адпачынак ці лячэнне ў Сочы, Ялту, Друскенінкай. У той жа час "новыя беларусы" кампаніямі шастаюць па заморскіх курортах, не лічачы грошай у кішэнях.

Калі чалавек становіцца багатым дзякуючы сваім разумовым, прафесійным здольнасцям, шчыруючы з ранку да ночы, — гэта адно, а вось калі мільёны і мільярды збіраюцца іншым шляхам, нячэсным, крымінальным, — гэта не можа не выклікаць агіду з боку сумленных людзей. Хто сёння ходзіць у золаце? У асноўным той, хто паспеў накрасці, калі развальваўся Савецкі Саюз, і працягвае гэта рабіць і па сённяшні дзень. Сярод тых, каго можна прылічыць да так званых алігархаў, нямала ўчарашніх высокіх чыноўнікаў. Карыстаючыся ўладай, яны на падстаўных асоб стварылі мноства фірм і фірмачак, забяспечыўшы іх надзейным дахам. Чаго грэх утойваць, усе ведаюць, што сёння, па-руску кажучы, без крышавання не абыходзіцца ні адзін больш-менш вядомы бізнесмен. Тыя, хто не прыняў такія правілы гульні, сядзяць на нарах.

Але я крыху збочыў ад тэмы. Мяне, як простага чалавека, больш хвалюе не тое, хто і якім чынам набівае кішэні, а тое, чаму ў Беларусі амаль няма людзей сярэдняга класа. Мабыць, таму, што дзяржава пакуль што не разняволіла чалавека, не стварыла ўмоў для яго нармальнай працы. Заўважце, чамусьці не з'яўляюцца алігархі на дзяржаўных прадпрыемствах. А прыватызацыя, як мне здаецца, у нас закончылася тады, як усё, што можна, было прыхватызавана. Цяпер выстаўляюць на аўкцыёны толькі тое, што дабіта да ручкі і што нікому не патрэбна. Ды і ці можа чалавек, які задыхаецца ад галечы, нешта прыдбаць ва ўласнасць? У яго ж ні капейкі за душой...

Што ні кажыце, а да таго часу, пакуль людзі сярэдняй рукі ў нас не зоймуць дамінуючае месца, ні аб якім росквіце эканомікі гаварыць нельга. Любая цывілізаваная краіна трымаецца не на алігархах, іх па прыродзе не можа быць шмат, а на людзях, якіх па ўсіх мерках адносяць да сярэдняга класа. Чым гэтая праслойка будзе больш таўсцейшай, больш моцнай, тым больш моцнай будзе і ўся наша Беларусь.

Пётр КРАСУЦКІ, беспартыйны.

"НЕПРИЧЕСАННОЕ" ПИСЬМО

Случайно ли то, что у «афганцев» отобрали льготы

Уважаемый главный редактор!

Высказываю свое мнение по отмене льгот. Коснусь "афганцев". Считаю, что в стране социализма, хотя и рыночного, иного и быть не могло.

На крутых поворотах истории подобное не раз было. После революции 1917 года вначале вычистили эксплуататоров-капиталистов, а затем принялись за тех, кто когда-то, защищая родину, защищал и их. Я имею в виду тех, кто создавал славу государства, отстаивал его на поле брани, — Георгиевских кавалеров. Их причислили к врагам трудового народа. Как так, ведь они имели "царские" ордена. Чего только им не приписывали! И то, что "они защищали царя", расстреливали всех и вся в гражданскую.

Еще лет 6—7 назад я в одной газете читал, как "органы" выявили вахмистра, в тридцатые годы полного Георгиевского кавалера и приписали ему то, что он, мол, заслужил награды у Колчака. Но, во-первых, орден св.Георгия имел особый статус. Им награждали за подвиги по отражению внешнего врага, врага, пришедшего из другого государства. Во-вторых, в гражданскую в Белой армии наград не давали. По словам Антона Ивановича Деникина, "безнравственно награждать за участие в братоубийственной войне".

Кстати, в Красной Армии было нравственно это делать. Так, первый орден Г.К.Жуков получил уже после гражданской, за подавление крестьянского восстания на Тамбовщине. Не говорю уже о тех, кто получил награды в гражданскую. Десять процентов всех орденов, розданных советской властью к тому времени, были "заработаны" на Тамбовщине. И неудивительно, поработали люди: если при царе в губернии было 5,5 миллиона человек, то сейчас в области 1,5 миллиона жителей. Через 85 лет тамбовский губернатор поставил голодному мужику памятник, а события тех лет назвал геноцидом крестьянства.

Жил у нас в селе через два дома от нас дед Роман Матлох. Тихий, ни к кому не ходил, к нему тоже никто. Дружил с моим отцом. По сути инвалид — левая рука была усохшей, последствия ранения. В 1960-х я приехал на каникулы. Как-то отец рассказал мне, что дед Роман — участник знаменитого Брусиловского прорыва, имеет два Георгия. Сгорая от любопытства, я отправился к деду. Но как только я завел разговор о наградах, дед испуганно стал открещиваться. Просил меня никому не говорить. Даже не поверил моим словам, что с 1943 года "великий и справедливый Сталин" разрешил носить Георгия. Даже ввел орден Славы, аналог Георгия. Та же лента, только вместо царского символа, вернее, символа веры — символ единства пролетариев всех пяти континентов.

Никакой помощи от государства дед Роман не имел. Правда, последних два года получал пенсию. С 1965 года крестьянам стали платить по 12,5 рубля в месяц.

Сравнивая с забугорным отношением к бывшим участникам войны, не перестаешь удивляться. В те же 1960-е годы советские газеты с возмущением писали, что бундестаг ФРГ увеличил пенсии "недобитым фашистским генералам". Как так? Далее — более. Если не ошибаюсь, в 1937 году Гитлер положил камень в фундамент завода по производству "народного автомобиля" — "Фольксвагена". 1000 марок вноси — и через несколько лет получишь "Дас Ауто". Но война есть война. Не только не получили немцы авто, но и с началом войны власти отняли имеющиеся, правда, выдали квитанции. Прошли годы. От Гитлера открестилось новое правительство уменьшенной Германии. А вот по долгам заплатило. Всем сохранившим квитанции выдали по "Фольксвагену". Новому, с конвейера. А не сохранил (война есть война, рушились, горели дома, а не только бумажки), то надо было подтверждение двух или трех соседей — и человек получал машину. Выдавали, верили на слово.

В нашем роду никто не запятнал себя службой фашистам. Не только мужики были на фронте. Три дяди погибли, и эта же участь постигла и самого старшего двоюродного брата. Похоронка пришла 5 мая, когда уже сообщили о Победе. Среди вернувшихся не было ни одного, у кого бы не было ранения и наград. Воспитание я получил очень патриотическое. Отец часто говорил о полицаях: "Как можно было идти на службу к врагам, ведь нельзя победить наш народ! Вот татар через 250 лет выгнали. Позор на весь род — служба врагу!" Он даже в 1941 году пытался агитировать полицейских в подобном духе. Кончилось тем, что его поместили в полевую жандармерию. Через месяц или полтора мать "выкупила" его у следователя с помощью старосты. Хороший был человек староста Филимон, помог матери. Да и в 1945 году немец не так свирепствовал. Да и отец стоял на своем — специально хотел выведать, не заслан ли кто в полицию партизанами. Месяца три пришлось отходить от побоев. А в 1944 году отец, полный "белобилетник", скрыв этот факт, ушел на фронт. "Стыдно отсиживаться дома".

Я написал это, чтобы меня не упрекали и не плевались за мои взгляды, они на сто процентов патриотические. Но мне симпатична позиция бундестага. Главное — преемственность власти. Власть, а точнее государство, послала на войну. И какая бы ни была власть, какое бы ни было государство, они заботились о тех, кого посылали под пули, у кого брали деньги взаймы на строительство заводов. Вернуть обещанное в полном объеме — это по-государственному. Чтобы народ, военные знали, что будет кому позаботиться о каждом, даже если у руля государства станут другие, не разделяющие взглядов предыдущего правительства и даже с другой идеологией. И обещанное исполнят.

Конечно, у нас все не так. А потому отмена льгот для "афганцев" не могла не произойти. И в заключение почитайте книгу "Память", о погибших "афганцах". Чьи дети воевали за пределами Советского Союза? Ни одного сына партийно-советского работника любого ранга. Вот и стоит призадуматься: а зачем порой "ложиться под танк"? Станешь инвалидом, что-то сменится в государстве, и кому ты нужен будешь без ног или рук? "Государству ты нужен и видит оно тебя, пока ты здоров", — с горечью говорят старики. В чем была вина тех ребят, которых отправили воевать в Афганистан? Ни в чем! Так почему они не должны рассчитывать на поддержку со стороны государства? Они имеют на это полное право.

На ваше усмотрение, главный редактор! Напечатаете — спасибо, гонорара не надо. Не напечатаете — хоть прочтете.

Дай Бог вам и всем сотрудникам редакции мужества и оптимизма. Вернее, не потерять их.

С глубоким уважением —

Леонид Романович КОРОТКИН, давнишний читатель.

д.Вереньки Поставского района.

ВАС ЦІКАВІЦЬ...

Памылкі выпраўляюцца

Неяк у "Народнай волі" быў надрукаваны матэрыял пра тое, што Анатоль Лябедзька стаў невыязным з краіны і што яму ў пашпарце нават праставілі адпаведны штамп. Вы і штамп гэты надрукавалі. І гэта быў проста сорам, бо нібыта разумныя людзі зрабілі штамп не проста з памылкамі, а немаведама на якой мове. Няўжо яны і зараз "лепяць" такія штампы?

Васіль Рубінчык, г.Бабруйск.

Дзяржаўны пагранічны камітэт Беларусі ўжо пачаў замену ў пунктах пропуску на мяжы штампаў, у тэкстах якіх былі дапушчаны граматычныя памылкі — "У выезде адказана", на штампы з правільным варыянтам — "У выездзе адмоўлена". Пра гэта паведаміў начальнік прэс-цэнтра пагранічнага ведамства Аляксандр Цішчанка, зазначыўшы, што ў адзін момант зрабіць гэта не атрымаецца.

Дарэчы, тэкст спецыяльнага штампа ў пашпарце зацверджаны пастановай Дзяржаўнага пагранічнага камітэта. Вось каго трэба садзіць за парты і вучыць беларускай мове, каб не ганьбілі краіну!

Ігар МАРОЗАЎ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
13 САКАВІКА 2008 г.

События в мире: европейский взгляд

ЗАКУЛИСЬЕ

Политика вентиля

Формально недавний кризис между российским газовым гигантом и украинским правительством разразился из-за неурегулированной задолженности по поставкам за конец прошлого — начало этого года.

О скрытых мотивах в интервью корреспонденту BBCRussian.com рассказал украинский политолог, директор центра политического анализа ПЕНТА Владимир Фесенко. Вот фрагменты из интервью.

Би-Би-Си: Подоплека последнего газового кризиса исключительно экономическая, или здесь следует искать политику?

В.Ф.: Политический контекст и политический подтекст, несомненно, присутствуют.

Спусковым крючком для кризиса стало то, что правительство Тимошенко, как только оно пришло к власти, попыталось вытеснить с газового рынка Украины компанию "Росукрэнерго", одним из учредителей которой является "Газпром". "Газпром" нанес ответный удар, выставив претензии украинской стороне по поводу неоплаты потребленного газа.

Вторая политическая составляющая связана с существующей напряженностью между президентом Украины Виктором Ющенко и главой правительства Юлией Тимошенко по газовому вопросу. Есть очевидное различие позиций. Президент делает акцент на сохранении относительно невысокой цены на газ и на бесконфликтных отношениях в газовой сфере. Для Тимошенко же, судя по всему, принципиально важно сохранить полный контроль над газовыми потоками на внутреннем рынке Украины и, соответственно, над финансовыми потоками в газовой сфере...

Надо заметить, что для представителей Индустриального союза Донбасса, которые представлены и в команде премьера, и в руководстве "Нафтогаза", важно сохранить низкую цену на газ. И в этом плане их интерес совпадает с интересом президента Ющенко.

А вот для Тимошенко важно обеспечить масштабные социальные выплаты, которые она сейчас осуществляет. Если не будет денег от продажи газа, то тогда возникнет напряженность и в бюджетной сфере.

С другой стороны, она не хочет обострять отношения с президентом, которые и без того сейчас находятся в не очень хорошем состоянии. Она не хочет нервировать президента и его секретариат, выставляя какие-то принципиально иные условия по газовому соглашению, нежели те, которые были достигнуты самим Ющенко в Москве.

Би-Би-Си: Кого выгодно поддерживать российской стороне?

В.Ф: "Газпром" не то чтобы поддерживает кого-то, он опирается на договоренности двух президентов, но при этом играет на противоречиях между украинским президентом и правительством. Это, наверное, самое главное обстоятельство.

Би-Би-Си: А как себя в этой ситуации ведет бывший глава правительства Украины Виктор Янукович?

В.Ф.: "Партия регионов" попыталась использовать этот газовый кризис в своих интересах. Янукович и его сторонники хотят, чтобы правительство представило отчет по вопросу газовой войны на одной из сессий парламента, и называют это одним из условий разрешения нынешнего парламентского кризиса.

Газовой проблемой пытаются воспользоваться все задействованные в политическом кризисе стороны. Президент будет использовать его как инструмент давления на Тимошенко. Оппозиция может использовать эту тему для обвинений в адрес правительства, а может быть, и потребовать отставки правительства.

КАЛЕЙДОСКОП

Отсудила 124.000 красных роз

Жительница Ирана подала в суд на своего слишком жадного мужа и отсудила у него 124.000 красных роз, которые он должен теперь подарить в счет тех десяти лет, пока она терпела его скаредность, передает агентство AFP.

"Мы поженились десять лет назад. Но вскоре я поняла, что Шахи страшно скуп, — рассказала Хенгаме. — Когда мы приходили в ресторан, он даже отказывался заплатить за мой кофе".

В конце концов Хенгаме решила наказать супруга, заставив его вернуть эквивалент приданного, которое он взял за ней, когда женился. Согласно иранским законам, замужняя женщина может в любой момент потребовать от мужа свое приданое.

Стоимость 124.000 роз, которые Шахин должен отдать жене, равняется 200 тысячам долларов. На суде он заявил, что не может "выплатить" все сразу и готов возвращать по пять роз в день.

Суд со своей стороны постановил конфисковать квартиру Шахина стоимостью в 64 тысячи долларов, которая будет удерживаться в качестве залога до тех пор, пока он не подарит жене все 124.000 красных роз.

Евросоюз собирается закрыть «налоговые оазисы»

Берлин и Париж потребовали от Евросоюза пересмотреть европейские нормы по борбе с уклонением от уплаты налогов. Причиной такого демарша стал скандал вокруг банков Лихтенштейна. С их помощью состоятельные граждане уходят от высоких налогов в своей стране.

Нынешняя директива ЕС о налоге на вклады, принятая в 2005-м году, направлена против вывода средств в зоны низкого налогообложения — в так называемые "налоговые оазисы", напоминает Euronews. Она фактически отменяет понятие тайны вкладов, обязывая банки передавать информацию о вкладчике налоговым органам страны, гражданином которой он является.

Австрия, Бельгия и Люксембург добились для себя исключения из правил. Льготные налоговые и банковские режимы в Европе действуют также в Лихтенштейне, Монако, Андорре и Швейцарии. Этим и пользуются состоятельные жители Евросоюза, чтобы уклониться от уплаты налогов на родине.

Ликвидация льготных налоговых и банковских режимов стала одной из главных тем встречи министров финансов ЕС 3 марта в Брюсселе.

В среднем, по данным немецких властей, в финансовых оазисах ежегодно растворяется до 30 млрд евро, приводит данные "Независимая газета". Германия настаивает на приведении налогового и банковского законодательств четырех стран-оазисов к единым европейским нормам.

СМИ сообщают, что немецкий канцлер Ангела Меркель добилась от князя Монако Альберта II обещаний раскрыть списки иностранных вкладчиков. Одновременно Германия призвала ЕС добиться от Лихтенштейна изменений банковского законодательства для сближения с европейским. Прокуратуры США, Франции, Канады, Новой Зеландии и других стран уже начали собственные расследования о происхождении счетов в банках Лихтенштейна.

Власти Монако заявляют, что хотят избежать повторения у себя скандала, который разгорается вокруг банков Лихтенштейна, где, по данным немецких властей, отмывали доходы высокопоставленные бизнесмены и чиновники из ФРГ.

Прокуратура Лихтенштейна начала собственное расследование из-за хищения из банка LGT секретной информации со списками иностранных вкладчиков. В украденной базе данных, по сведениям агентства AFP, есть сведения о счетах граждан США, Великобритании, Италии, Испании, Австралии, Новой Зеландии, Швеции, Финляндии, Норвегии, Канады и других стран.

Именно эта утечка спровоцировала громкий скандал в Евросоюзе, сопровождавшийся требованиями прикрыть налоговые и банковские офшоры для граждан в Лихтенштейне и других странах с мягкими налоговыми и банковскими режимами.

Отголоски этого налогового скандала могут ощутить и в России. По словам немецкого политолога Александра Рара, спецслужбы ФРГ получили из банков Лихтенштейна информацию о вкладчиках, среди которых есть и россияне. Общая сумма финансовых вложений россиян в банки Лихтенштейна, по оценкам экспертов, может превышать несколько миллиардов долларов.

ФОТОВЗГЛЯД

На проходящем в Женеве автосалоне был представлен футуристический концепт-кар Nissan Pivot 2.

СЛЫШАЛИ?

Пятая компьютерная революция

В Ганновере прошла крупнейшая выставка информационных технологий и коммуникаций CeBIT. Ее открыли канцлер этой страны Ангела Меркель и президент Франции (страны — партнера выставки этого года) Николя Саркози в присутствии многочисленных представителей компьютерного и информационного бизнеса, включая главного исполнительного директора корпорации Microsoft Стивена Баллмера.

Выставка показала, что сегодня самая актуальная задача для производителей персональных компьютеров и серверов — снижение расходов на электроэнергию. В центре внимания, конечно, был интернет. Ведь это теперь средство коммуникации не только для людей. К примеру, представьте себе, что автомобиль обнаруживает яму на дороге и... посылает сигнал другим автомобилям, причем этот процесс полностью автоматизирован. От водителя ничего не требуется. Эти и другие технологические новинки можно было увидеть на ярмарке CeBIT".

Стивен Баллмер рассказал публике о "пятой" компьютерной революции. Он также продемонстрировал собравшимся подготовленный его корпорацией новейший плоский компьютер, не нуждающийся в привычной "мышке", а повинующийся движению пальцев по экрану. "Вот я беру Саркози и делаю его большим", — сказал он, продемонстрировав, как можно "взять" фотографию человека из пачки снимков в центре экрана и с помощью поворота пальца увеличить ее на полэкрана.

"Да, я согласна со Стивеном Баллмером — информационная революция изменила нашу жизнь. Компьютер прочно вошел в наш быт, и современные молодые люди часто знакомятся и общаются друг с другом посредством интернета, даже ни разу не встретившись", — сказала Меркель. Однако она уверена, что, несмотря на все большую компьютеризацию повседневной жизни, "стремление людей к живому общению не исчезнет, и именно эта черта отличает человека от самой совершенной машины". "Но стоит задуматься над ответственным использованием этих информационных возможностей", — отметила глава федерального правительства.

СМИ подчеркивают, что компьютерная революция набирает все новые обороты, бурно развиваются интернет-технологии и робототехника, невиданные перспективы открываются генной инженерией и нанотехнологией. Человечество обретает новые, поистине колоссальные возможности. Но сможет ли оно ими правильно воспользоваться? Какие новые проблемы вызовет их практическая реализация? Судьбоносная, стратегическая задача состоит в том, чтобы сохранить контроль над размножением новых проблем. Это возможно лишь на основе преодоления ментальности, возводившей в высший ценностный ранг новацию саму по себе. Современность требует развития нового типа научного мышления, ориентированного в равной мере как на новации, так и на оценку их последствий негативного характера.

Демонтирован последний памятник Ленину

В Душанбе демонтирован последний памятник Владимиру Ленину, сообщает ИА "Central Asian News". Монумент, стоявший в центральном парке культуры и отдыха, передан в Художественный фонд республики.

На месте статуи Ленина, как сообщает РИА Новости, будет установлен памятник в честь классика таджикской литературы Абдуабдулло Рудаки. Парку уже присвоено его имя.

Бронзовый памятник Ленину работы Владимира Козлова был установлен в парке Душанбе в 1925 году. В столицу Таджикистана его привезли на верблюдах под охраной красноармейцев.

Собаки против пиратства

В Малайзии создано первое в мире подразделение полиции для борьбы с видеопиратством, укомплектованное служебными собаками, сообщает Associated Press.

Лабрадоры Пэдди и Мэнни были подарены малайзийской полиции Американской ассоциацией кинопроизводителей. Оба они родились в Северной Ирландии и прошли специальный курс обучения. Пэдди и Мэнни распознают по запаху материалы из которых производят DVD-диски и таким образом находят склады контрафакта.

Собак доставили в Малайзию 18 февраля. До апреля они будут адаптироваться к местным погодным условиям и новым людям, а после приступят к работе.

Власти страны решили организовать подобное подразделение после того, как два тренированных таким образом лабрадора — Лаки и Фло, которые были привезены в Малайзию на время, помогли обнаружить около 1,6 миллиона пиратских DVD. Сообщалось также, что за головы Лаки и Фло местные медиапираты назначили награду в размере 29 тысяч долларов.

Самые галантные европейцы

Больше всех в Европе оказывают помощь прекрасному полу в домашних делах шведские мужчины. К такому выводу пришли европейские социологи, передает ИТАР-ТАСС.

Они сравнили время, затрачиваемое представителями сильного пола разных стран на уборку, стирку, приготовление обедов и уход за детьми. Оказалось, что разделение труда в шведских домах практически равное.

Женатые мужчины в возрасте от 20 до 64 лет неизменно помогают женщинам во всех мелочах повседневной жизни. Причем подобный результат был достигнут не сразу и не по причине усиления активности сильного пола, а из-за большей загруженности на рабочих местах прекрасного.

На втором месте с небольшим отставанием оказались норвежцы и финны. Меньше всего помощи в домашних делах от мужчин получают женщины Италии и Испании.

ЗНАКОМЬТЕСЬ!

Будущая первая леди России

Как предполагается, она станет влиятельной фигурой за кулисами Кремля

Для широкой публики фигура жены Медведева Светланы почти неизвестна. Зато деятели культуры и светские персонажи знакомы с этой элегантной дамой довольно близко.

Один из близких ее приятелей — известный модельер Валентин Юдашкин, а с его женой Мариной они подруги, утверждает "Комсомольская правда". Личная симпатия привела Светлану в модный дом "Валентин Юдашкин", клиенткой которого она является больше двух лет. Несколько своих наиболее запоминающихся нарядов Медведева заказывала именно у него.

— Светлана — красивая русская женщина. В ней нет напыщенности и пафоса. Она всегда прекрасно выглядит и со вкусом одета, — считает Владимир Винокур, который довольно часто встречался с ней на правительственных приемах и благотворительных концертах. А еще он признался, что, хотя Светлана и дружит с Аллой Пугачевой, больше всего она любит творчество Льва Лещенко. Лев Валерьянович подтвердил, что со Светланой знаком:

— Такими слушательницами я могу только гордиться.

Девичья фамилия — Линник

Светлана Владимировна Медведева родилась в 1965 году в Купчине Ленинградской области в семье военнослужащих. Девичья фамилия — Линник. Она окончила Финансово-экономический институт, но по специальности работала недолго. Занималась организацией различных общественных мероприятий в Санкт-Петербурге.

В настоящее время является руководителем попечительского совета целевой комплексной программы "Духовно-нравственная культура подрастающего поколения России", созданной по благословению Патриарха Алексия II.

На официальных мероприятиях Светлана Владимировна появляется крайне редко, предпочитая им светские или благотворительные. Супруга Дмитрия Медведева — кавалер женского ордена Русской православной церкви "Преподобной Евфросинии Московской", вручаемого выдающимся женщинам России. Занимается благотворительностью: патронирует Санкт-Петербургский дом-интернат №1, в котором живет 316 воспитанников.

Светлана Линник училась в средней школе в Купчине, где и познакомилась со своим будущим мужем Дмитрием Медведевым, который учился в параллельном классе. В 1989 году они поженились. В 1995 году у супругов родился сын Илья.

Общительная и энергичная

Влиятельная австралийская газета The Sidney Morning Herald считает, что общительная и энергичная Светлана Медведева наладила нужные связи, которые позволили супругу вырваться из академической сферы в мир торговли и бизнеса: в середине 1990-х он стал директором лесозаготовительного комбината.

Уязвленная колкостями насмешников, что ее муж выглядит, как будто днюет и ночует в библиотеке, Медведева, по слухам, заставила мужа сбросить лишние килограммы и набрать мускулатуру. Она добилась этого, заставив Дмитрия Медведева освоить йогу и определив его в тренажерный зал и бассейн, где он дважды в день проплывает больше километра. Теперь же, как предполагается, она станет влиятельной фигурой за кулисами Кремля, а также будет, как говорит сам Медведев, обеспечивать "прочные и надежные тылы".

С учетом собственных познаний Медведевой в экономике и финансах, она могла бы сделать самостоятельную карьеру. Но, поскольку ее муж неплохо зарабатывал, сама она погрузилась в социальную работу, за которую удостоилась медали от РПЦ, а также вошла в мир высокой моды.

Она является одним из руководителей поддерживаемой церковью образовательной программы, имеющей целью навести духовный и нравственный порядок в среде постсоветского молодого поколения России. Этот противоречивый проект — часть движения РПЦ, направленного на возрождение религиозного образования в российских школах через 90 лет после того, как после революции большевики изгнали священников из классов.

Несмотря на утверждения недоброжелателей, что Медведев успел скопить крупное состояние, в недавно заполненной им декларации значится годовой доход, едва превышающий 75 тыс. долларов, квартира в Москве, земельный участок в Подмосковье и девятилетний "Фольксваген гольф", записанный на супругу.

Подпевала Кузьмину

СМИ утверждают, что скорее всего ее ориентиром будет Раиса Горбачева. Для этого есть все предпосылки: Светлана имеет опыт в сфере благотворительности, умеет красиво одеться, а к тому же любит быть в центре внимания.

Так было, например, когда два параллельных класса вместе отмечали 25-летие выпуска. Жена вице-премьера лично занималась организацией праздника и даже выступила в роли ведущей вечеринки. Светлана не выпускала из рук микрофон — говорила тосты, представляла повзрослевших одноклассников и даже пела вместе с хором учителей. Говорят, даже иногда подпевала приглашенному на торжество Владимиру Кузьмину. И много танцевала, причем далеко не всегда с супругом.

Кстати, первую часть праздника Света провела без мужа: Дмитрий приехал на вечер позже всех, когда гулянье было в самом разгаре. Вице-премьер был одет скромно: накинул пиджак поверх простенькой голубой футболки в полоску. Зато на Светлане был шикарный белый костюм, подчеркивающий ее фигуру. Все отметили, что за прошедшие годы привлекательность первой красавицы школы ничуть не поблекла. Наоборот, повзрослев, она стала еще интереснее.

Подготовил к печати Алесь ДРАБЧУК.

Новая яхта Абрамовича

В немецкой прессе появились фотографии новой дизайнерской мегаяхты. По неофициальным данным, ее построили для Романа Абрамовича.

Яхта поражает экстравагантностью жителей города Киль, в бухте которого ее испытывают. Постройка судна заняла три года, дизайн разработал знаменитый Филипп Старк. Сначала предполагалось, что корабль будет 118-метровым, но потом его удлинили до 130 метров. Сколько он стоит, можно только догадываться: среднюю цену грубо прикидывают по формуле "миллион долларов за метр".

"Сигма" — это проектное название яхты — займет четвертое место в мировом рейтинге, отмечает НТВ. На первом — 160-метровая "Голден Стар" эмира Дубая, шейха Мохаммеда Бен Рашид аль-Мактума. По сообщениям печати, у Романа Абрамовича сейчас три яхты.

Народная Воля http://www.nv-online.info
13 САКАВІКА 2008 г.

Галіна Пазьняк

Беларусь у сэрцы

(Працяг. Пачатак у №№7—10, 13—14, 17—18, 21—22, 25—26, 29—30, 33—34.)

СЯДЗІБА

Але, набыўшы юрыдычны статус, нашыя фронтаўскія праблемы ня скончыліся. У нас не было памяшканьня, не было сядзібы, і гэта вельмі абцяжарвала працу арганізацыі. Таму задача здабыць сядзібу для БНФ паўстала вельмі востра.

Займаліся гэтым некалькі чалавек. Беспасьпяхова (толькі змарнавалі час). Тады за справу ўзяўся зноў спадар Хадыка, патлумачыўшы гэта сваімі прыхільнымі сувязямі ў Гарвыканкаме. Час ішоў — сядзібы не было. Скончылася ўсё заявай спадара Хадыкі, што сядзібу здабыць у цяперашняй улады немагчыма. Ён нават пажартаваў: "Калі хто-небудзь гэта зробіць, я зьем свой капялюш".

Так трывала нейкі час. Патрэбна была новая ініцыятыва сяброў Фронту. Але пасьля такой "рэклямы" жадаючых узяцца за "безнадзейную" справу не знаходзілася.

За працу трэба было брацца таму, хто меў магчымасьць уплываць на ўладу (гэта значыць — дэпутату).

Параіўшыся з Пазьняком, я рашыла ўзяцца за гэтую справу, спадзеючыся, што дапамогуць свае дэпутаты Гарсавета. І памылілася. Займацца гэтым пытаньнем ня выявіў жаданьня ніхто з дэпутатаў, якія лічылі сябе на той час фронтаўцамі ці прыхільнікамі. Паспрабавала я зьвярнуцца і да Анатоля Гурыновіча. "Ты што, — адказаў Анатоль, — не разумееш, што гэта немагчыма?" Далей нашыя справы яго не абходзілі.

З чаго ж пачаць? Да каго зьвяртацца? Бадай — да старшыні Гарвыканкама спадара А.Герасіменкі. Спадар Герасіменка чалавек мяккі, выхаваны, разумны. Павінен зразумець.

Размаўляла, пераконвала, патрабавала. Шмат разоў. Адразу ён быццам і не адмовіў. Але ў рэшце рэшт адказаў: "З радасьцю б, але ўсе прыдатныя для арганізацыі памяшканьні занятыя, вольных — няма".

Справа ня рухалася. Ад бяссільля я нават паўжартам прыгразіла, што распачну галадоўку і памру ў ягоным кабінеце. У адказ Аляксандар Міхайлавіч разьвёў рукамі: ваша справа, маўляў. Паміраць, вядома, я не зьбіралася, але зразумела, што тут — глухая сьцяна.

Наступным, да каго я зьвярнулася, быў першы намесьнік старшыні Гарвыканкама спадар Уладзімер Ярмошын. Тут размова пайшла інакш. Спадар Ярмошын, здавалася, выказаў нават спачуваньне, казаў, што разумее праблему і нават тое, што Беларускі Народны Фронт — гэта ня тая арганізацыя, якую можна адправіць куды-небудзь у Чыжоўку. Зразумела, патрэбен цэнтар горада. Але — у цэнтры ўсё занята.

— Але ж ёсьць шмат памяшканьняў з былой уласнасьці КПСС (КПБ), — кажу.

— Так, — пагаджаецца сп.Ярмошын, — добра, паспрабуем пашукаць. — І накіроўвае мяне ў Гарадзкое ўпраўленьне нежылых памяшканьняў (здаецца, так называлася), назваўшы прозьвішча чыноўніка. Маўляў, калі што і ёсьць, то гэта ў яго "гаспадарцы". (Трэба сказаць, што ўсе дачыненьні ўлады, уся яе сістэма на той час мне была невядомая, я ніколі не сутыкалася з гэтай сфэрай дзейнасьці, таму шчыра паверыла ў тое, што пачула.

Толькі потым, блукаючы па ўладных калідорах, я зразумела, што ўсе гарадзкія чыноўнікі падначаленыя Гарвыканкаму. Існаваў загад "вырашыць" ці "адмовіць", і ён выконваўся заўсёды, калі загад існаваў. І не выконваўся — калі загаду не было.)

Тым ня менш я паверыла, што справа зрушылася. Цяпер я "маю" падтрымку высокага гарадзкога чыноўніка і прымушу ніжэйшага выканаць тое, што трэба, думала я.

Ня памятаю хто, але нейкі супрацоўнік Гарвыканкама (выключна "з павагі да мяне", зразумела) па сакрэту (і "па-сяброўску") паведаміў, што той, да каго я мушу ісьці, — бярэ хабар. Знайсьці, маўляў, памяшканьне ён, канешне ж, зможа, але трэба яму даць хабар. Калі ж я пайду, маўляў, напралом, буду патрабаваць, — нічога ня выйдзе. Ды і, у рэшце рэшт, што, Народны Фронт ня знойдзе нейкіх там пару сотняў?..

Але я сабе падумала: каб я хабар плаціла — ніколі!

Прыйшла ў кабінет. Пачаліся цяжкія перамовы.

— Разумею, што справа нялёгкая, — кажу. — Але ж трэба знайсьці выйсьце.

— Добра, — адказвае. — Будзем думаць.

— Колькі будзем думаць? — пытаю.

Дамовіліся, што прыйду праз тыдзень. Праз тыдзень ён захварэў, потым — быў у камандзіроўцы, а потым, як толькі я прыходзіла, аказвалася, што ён толькі што выйшаў "на аб'ект".

Што рабіць? Вырашыла так: буду хадзіць ва Упраўленьне за паўгадзіны да пачатку рабочага дня (на працу ж ён калі-небудзь зьявіцца). Так і спаймала. І тут ужо адгаворкі "зараз заняты" ў яго не прайшлі: я скарыстала свой дэпутацкі статус і прымусіла заняцца маім пытаньнем.

Сталі разьбірацца ў так званай "нежылой" маёмасьці. Нарэшце, мне прапаноўваецца памяшканьне з былой маёмасьці КПБ насупраць менскага цырка. Месца цудоўнае. Я вельмі ўзрадвалася. На крылах паляцела паглядзець і пераканалася, што і месца, і плошча памяшканьня — тое, што нам трэба.

Пачалося афармленьне папераў. Патрэбна была згода Гарвыканкама, якую, у рэшце рэшт, я здабыла. Але... Як мне патлумачылі, нежылая маёмасьць у Менску (у тым ліку і тая, якая засталася пасьля забароны КПСС-КПБ) знаходзіцца ў ведамстве горада прыкладна на палову, а на палову — у Саўміна. Трэба згода Кебіча. Горад, маўляў, напіша запыт у Саўмін з просьбай выдатканаць плошчы гораду, Саўмін пагодзіцца, і тады горад аддасьць памяшканьне нам.

Пачалося доўгае чаканьне, у выніку якога, нарэшце, прыйшоў адказ, што названыя плошчы выдаткаваныя гораду быць ня могуць, бо гэта ёсьць маёмасьць Саўміна.

Зразумела, што гарадзкі чыноўнік з самага пачатку ведаў гэта, але вырашыў так мяне павадзіць па крузе.

Выступ на канферэнцыі БНФ, чэрвень 1996 г.

— Добра, — вырашыла я, — табе гэта так ня пройдзе. Цяпер ты ў мяне закруцішся, як ваўчок.

І пачалося адкрытае змаганьне дэпутата з чыноўнікам.

Я вырашыла пракантраляваць яго асабістую працу, і неўзабаве высьветлілася, што неяк дзіўна працуе гэты чыноўнік. У свой рабочы час знаходзіцца невядома дзе і невядома чым займаецца. Я пачала зьвяртацца з дэпутацкімі запытамі, патрабаваць адказу. Нешта тут было нячыста, але паспрабуй, схапі яго за палец. З другога боку, і яму ўвесь час быць "пад кантролем" народнага дэпутата нязручна. На гэта, зразумела, у мяне ішло шмат асабістага часу, але нічога ня зробіш.

Чыноўнік ужо ня ведаў, як ад мяне адчапіцца. Нарэшце, ён паведаміў мне, што знайшоў варыянт — на Варвашэні, 8. Але праблема ў тым, што памяшканьне занятае арганізацыяй (зараз ня памятаю назву), якую трэба адтуль яшчэ выселіць, бо яна займае гарадзкія плошчы на Варвашэні, 8 незаконна, пабудаваўшы сабе два ці тры паверхі ў высачэзным будынку на Юбілейнай плошчы (у доме з "караблём" наверсе). Новыя плошчы, маўляў, здае, мае прыбытак, мае моцную падтрымку ў Саўміне, таму "горад" на іх уплыву ня мае. "Калі жадаеце і калі варыянт вам падыходзіць — спрабуйце, — прапанаваў мне чыноўнік, — толькі напачатку паглядзіце, ці яно вам падыдзе", — параіў ён. Але гэта рабіць трэба было асьцярожна, бо жадаючых паглядзець памяшканьні ўжо было нямала, і "гаспадары" вока трымалі пільна.

На Варвашэні, 8 два ўваходы: з вуліцы і са двара. Напачатку я абсьледавала яго з вуліцы, але дзьверы тут былі наглуха забітыя, і "ўваход" такім чынам адсутнічаў. Вокны былі нечым застаўленыя — ня надта і разгледзіш. Відаць толькі, што плошчы, быццам, нядрэнныя. Каб не прыцягваць увагі, спрабую зайсьці ў будынак з двара ў абедзенны перапынак (калі народу няшмат). І тут жа натыкаюся на чалавека, які зьнешне нагадвае тыповага партыйнага работніка: "Вам чего?"

— Ды так, — кажу, — хачу як дэпутат паглядзець, што гэта за "ваенны аб'ект".

Той насьцярожваецца, а я ўпэўнена іду па пакоі. Усюды брудна, валяюцца паперы. Вока трапляе на дзіру ў падлозе, пакрытай амаль згніўшым ленолеумам. І як тут могуць працаваць людзі?

Заходжу ў вялікую залю. "Пільнае вока" — за мной. "Што вы тут аглядаеце?" — пытаецца ён тонам "гаспадара жыцьця".

Я таксама задаю пытаньні. "Партыйны работнік" не адказвае, а пачынае раптам крычаць і выганяць мяне. Я прад'яўляю дэпутацкае пасьведчаньне і ўжо сур'ёзна пытаюся, што гэта за арганізацыя, чаму не пераязджае ў новы будынак.

Тады ён злосна ашчэрыўся:

— Вам этого помещения никогда не видать как своих ушей! Мы, камунисты, здесь были и будем, а с вами — разберемся. (Вочы яго глядзяць са злобай і нянавісьцю.)

— Хто з кім разьбярэцца, пабачым, — кажу яму, — а памяшканьне гэтае вы хутка вызваліце. І не дапамога вам ваш Саўмін. Ня тыя часы.

Выйшаўшы з будынка, я ськіравалася ў Гарсавет. Галоўнае, я цяпер ведаю, што гэта памяшканьне нам падыходзіць і па плошчы (160 м2), і па месцы знаходжаньня. Засталося — адваяваць яго, ня маючы ні аднаго прыхільніка ва ўладзе, а толькі адзінае невялічкае дэпутацкае пасьведчаньне.

Але права на маім баку, і праз нейкі час, зь вялікімі цяжкасьцямі, але памяшканьне было вызваленае.

Цяпер трэба было заключаць умову са ЖРЭА. З адпведнымі паперамі Гарвыканкама іду да кіраўніка. Той паведамляе, што частка памяшканьня (маленькі пакой, уваход у які са двара) яны забяруць і паставяць перагародку, бо той пакой патрэбен ЖРЭА. "Нам таксама патрэбен гэты пакой для працы Чарнобыльскага камітэта", — адказваю.

Спрабую знайсьці дапамогу сярод дэпутатаў, у Гарвыканкаме, раюся з сябрам Сойму Верай Чуйко (на тыя часы маёй прыяцелькай). Вера раіць пагаджацца з тым, што мне прапануюць (бо, маўляў, ня будзем мець нічога). Я не пагаджаюся і раюся з Пазьняком, разам мы размаўляем зь юрыстамі, шукаем выйсьце. Я ніяк не хачу пагаджацца на зьмяншэньне плошчы, але ёсьць пэўная рызыка. Пазьняк падтрымлівае мяне: "Трэба змагацца!" І я зноў ськіроўваюся да начальніка ЖРЭА: патрабую, знаходжу аргуманты, іду ў наступ, для большай вагі прыходжу ў кабінет зь юрыстам — і ён адступае. Неўзабаве — паперы падпісаныя на ўвесь будынак у 160 м2.

Гэтае маё змаганьне яшчэ раз пераканала, што ніколі нельга здавацца, трэба выкарыстоўваць усе магчымасьці, каб дамагчыся перамогі, а калі барацьба справядлівая — дапаможа Бог.

Цяпер застаецца падпісаць умову з дамакіраўніцтвам. Але, нарэшце, і гэта зроблена. Адзіная цяжкасьць: рамонт будзем рабіць самі, бо, як высьветлілася, у домакіраўніцтва грошай на рамонт няма.

Іду да Пазьняка ў Вярхоўны Савет. Ён ведае пра шматлікія перашкоды, таму гатовы і на няўдачу. А тут такая радасная нечаканасьць: ключ ад нашага памяшканьня! Едзем глядзець. Па дарозе хвалююся: пакоі пакінутыя непрыбранымі, там суцэльная разруха. Адчыняем, уключаем сьвятло. Неверагодная колькасьць прусакоў разьбягаюцца ў розныя бакі (за сьцяной быў прадуктовы магазін дый "камуністы" тут, відаць, абедалі, не адыходзячы ад вытворчасьці, вось і разьвялі).

— Нічога, — кажа Пазьняк, — вытурылі камуністаў, вытравім і прусакоў. Усё гэта мы прыбяром, вычысьцім і адрамантуем. Галоўнае — ёсьць сядзіба.

Пасьля доўгіх пакутаў без свайго фронтаўскага "дому" нам хацелася як найхутчэй "засяліцца" на Варвашэні,8. Але Пазьняк катэгарычна паставіў задачу хораша адрамантаваць будынак, і не абы як, а на добрым узроўні: "Па нашай сядзібе людзі будуць усрымаць і нас, і яна павінна быць прыстойнай, чыстай і сьветлай".

Як канцэптуальна будзе выглядаць нашая сядзіба (унутраны плян памяшканьня, інтэр'ер, сьвятло і спалучэньне колераў, праекты дзьвярэй, аконных кратаў, карнізаў, шпалеры, плітка, праекты мэблі — усё да дробязяў) Зянон Пазьняк абмяркоўваў з нашымі лепшымі беларускімі мастакамі — Хведарам Ладуцькам, Міколам Купавам і іншымі. А работы там было, як кажуць, пачаць і скончыць. І мы ўзяліся за рамонт.

Спачатку патрэбна было набыць будматэрыялы, кошты на якія ўзрасталі кожны дзень і вельмі значна. Гэта быў час інфляцыі а на справе — час дэфіцыту (і "блату"), час штодзённага росту цэнаў.

У крамах і на базах-складах раскуплівалася ўсё імгненна — і ўсё падрад. Такая сітуацыя выкарыстоўвалася дзялкамі ў гандлі "на ўласную кішэнь". Купіць патрэбнае па прымальных цэнах без званка высокага начальніка (без "блату") ці без даваньня "на лапу" гандляру (ці хоць бы грузчыку) было немагчыма, бо ў крамах, як правіла, прадавалася самае горшае, бракованае, так званая "некандыцыя", старога выпуску, непрыгожае — адным словам, кандовай савецкай вытворчасьці. Але над усім панаваў яго вялікасьць дэфіцыт і савецкая хранічная хвароба — "блат".

А нам патрэбна было, як кажуць, усё і адразу. Да таго ж, мастакі патрабавалі пэўнай якасьці, колеру, малюнку, структуры, гатунку. Хадзіць па розных профільных крамах у пошуках неабходнага азначала папросту губляньне часу: нічога патрэбнага ў свабодным продажы не было.

Каб не губляць час, я зноў пайшла да старшыні Гарвыканкама А.М.Герасіменкі. "Горад выдзяліў нам памяшканьне, якое патрабуе капітальнага рамонту. Патрэбна мяняць ня толькі падлогу, а нават лагі, ня кажучы пра іншае. У ЖРЭА "няма грошай" на рамонт, і мы павінны рамантаваць яго сваімі сіламі, за свой кошт. Мы — арганізацыя грамадзкая (не камэрцыйная). Якія ў нас грошы? Таму дапамажыце нам найхутчэй набыць будматэрыялы, бо цэны растуць кожны дзень", — зьвярнулася я да спадара Герасіменкі.

Мне было лёгка патрабаваць, бо за часы дэпутацтва я ніколі не карысталася сваімі паўнамоцтвамі на ўласную карысьць. Чыноўнікі заўсёды ведалі, хто з дэпутатаў "чым дыхае", і тых, якія дбалі не пра сваё ўласнае, а пра грамадзкае, — паважалі і нават нярэдка дапамагалі, нягледзячы на тое, што гэта былі асобы "з супрацьлеглага лягеру". І гэтая павага адчувалася паўсюдна і на ўсіх узроўнях (ад старшыні Гарвыканкама да самага простага інспэктара якога-небудзь "упраўленьня").

Тыя ж дэпутаты, якія пачалі скарыстоўваць свой мандат на ўласную карысьць, не карысталіся аніякай павагай. Да іх чыноўнікі ставіліся грэбліва (што зусім не азначала, быццам яны самы не карысталіся службовым становішчам на ўласную карысьць).

Трэба сказаць, спадар Герасіменка тут жа ў маёй прысутнасьці па тэлефоне аддаў загад чыноўніку з Гарвыканкама "дапамагчы дэпутату ў яе просьбах". Згаданы чыноўнік аддаў загад на гарадзкую базу будматэрыялаў "выпісаць дэпутату тое, што яна запатрабуе".

Мне вельмі хацелася зрабіць усё хутчэй. А трэба было найхутчэй набыць дошкі і лагі для падлогі, фарбы-лакі, цьвікі, шпалеры, карнізы, вагонку, плітку для санітарнага пакою і сантэхніку, люстэркі, шторы, дэдэрон, фіранкі, дывановыя дарожкі, клей, іншыя дробязі, розныя будаўнічыя інструмэнты і прывезьці ўсё ў сядзібу.

З боку кіраўніцтва Фронту да мяне быў вялікі давер, таму мы з Хведарам Ладуцькам езьдзілі па розных філіялах базы будматэрыялаў, дамаўляліся і набывалі ўсё неабходнае. Ён выбіраў патрэбнае, я як дэпутат "забясьпечвала" бесперашкоднае набыцьцё неабходнага, сачыла, каб не было ніякіх перашкодаў "на месцы" (дэпутацкі статус і ўсьведамленьне, што я стараюся не дзеля сябе асабіста надавалі мне неверагодную ўпэўненасьць і "адчынялі" дзьверы ўсюды). У нас усё атрымалася. Мы набылі дакладна ўсё тое, што плянавалі мастакі.

Цяпер трэба было ўсё набытае са складаў і базаў прывезьці ў сядзібу. Асаблівыя цяжкасьці былі з дастаўкай доўгіх дошак і лагаў з далёкай базы. Каб іх не пілаваць, патрэбна была доўгая машына (мэтраў шэсьць). Але раз такая машына была патрэбная, я яе знайшла. Гэтаксама я замаўляла краты для сядзібы і ўваходныя дзьверы, як зараз кажуць, антыўламанёвыя. Праект дзьвярэй і кратаў таксама рабіў спадар Хведар, і нам іх зрабілі дакладна такія, як было замоўлена.

Калі патрэбны былі людзі на пагрузку-разгрузку, кіраўніку Фронту дастаткова было толькі назваць, колькі патрабуецца чалавек. Усё рабілася без затрымкі, і неўзабаве будматэрыялы былі набытыя па самых лепшых для нас цэнах і прывезеныя ў сядзібу.

ФРОНТАЎСКАЯ ТАЛАКА

Наступны этап — рамонт сядзібы. Гэта была вельмі вялікая праца, якая патрабавала ўдзелу ўсяго Фронту, але яе трэба было некаму каардынаваць. Ведаючы, што ўсе вельмі занятыя, я прапанавала Пазьняку, што сама давяду рамонт да канца. Ён пагадзіўся, але калі мы абмяркоўвалі некаторыя дэталі, Пазьняк між іншым адзначыў, што неабходна набыць яшчэ і шпон для карнізаў.

— А што такое шпон? — спытала я. Пазьняк неяк разгубіўся.

— Вы ня ведаеце, што такое шпон, і зьбіраецеся каардынаваць рамонтныя працы?

— Не хвалюйцеся, Зянон Станіслававіч, — рашуча адказала я, — ня ведаю, дык даведаюся. Галоўнае — жаданьне зрабіць усё найлепш і найхутчэй. А ня буду нечага ведаць, дык спытаю ў вас, — усьміхнулася я, бязбожна камплімэнтуючы старшыню. — І хто яшчэ мае час гэтым займацца?

Пазьняк адчуў іронію, але вымушаны быў пагадзіцца. Кіраваць рамонтам сядзібы быў запрошаны спадар Мікульскі, якому Фронт некалькі месяцаў плаціў заробак.

Рамантавалі, праўда, не адзін месяц. Талака па стварэньні сядзібы была ўспрынята зь вялікім энтузіязмам і шмат хто з фронтаўцаў працаваў ахвярна і шчыра. Але працы было вельмі шмат. Яна патрабавала спэцыялістаў. Спэцыялісты ў Фронце былі, але кожны дзесьці працаваў, людзі былі вельмі занятыя ўвесь сьветавы дзень. Прыйшлося браць адгулы, невялікі адпачынак за свой кошт. Адначасна рабіўся і поўны рамонт санвузла з выкладаньнем керамічнай пліткі.

А яшчэ трэба было зчысьціць старую фарбу з аконных рамаў і падаконьнікаў, якія былі ў страшэнна запушчаным стане, прывесьці ў парадак дзьверы (зьняць шматслойную старую фарбу і пакрыць шпонам), пафарбаваць-паклеіць — і шмат-шмат чаго яшчэ. Фактычна мы атрымалі толькі сьцены, усё астатняе вымушаныя былі рабіць самы.

Вырашылі, што раённыя Рады будуць прысылаць па некалькі чалавек кожны дзень. На справе адбывалася па-рознаму (людзі былі занятыя на працы), і толькі ў выхадныя дні работа кіпела.

Прайшло некалькі месяцаў. На Управу мы па-ранейшаму зьбіраліся ў розных месцах: нашае памяшканьне для працы прыгатаванае не было. На кожным пасяджэньні Управы мне прыходзілася зьвяртацца да кіраўнікоў Радаў з адным і тым жа: каб на рамонт сядзібы людзі прыходзілі кожны дзень, каб рамонт ішоў бесперапынна. Я патрабавала ад кожнага сябра Управы таксама адпрацаваць на агульную карысьць. Але ад некаторых дамагчыся працы было цяжка. (Як ні дзіўна, але гэта былі ў асноўным якраз тыя людзі з кіраўніцтва Фронту, якія потым, у 1999-м, адыдуць ад адзінага БНФ у "аб'яднаную апазыцыю".)

Асабіста мне вельмі шкада, што сядзібу Фронту потым, пасьля расколу руху, захапілі тыя, хто амаль не прыклаў ніякіх намаганьняў да яе набыцьця і аднаўленьня. У час расколу, у 1999-м, усе фронтаўцы былі занятыя тады клопатам пра захаваньне адраджэнскай арганізацыі і ня думалі пра сядзібу. Гэта было ўпушчэньне, бо ўсё робіцца ў сваім часе.

Старшыня Фронту вельмі клапаціўся, каб наша сядзіба была прыкладам высокага беларускага густу. Таму ўнутраны дызайн памяшканьня шмат разоў абмяркоўваўся, удакладняўся з мастакамі-адраджэнцамі: вышыня сцэны, унутраныя колеры (сьцены і падлога), форма і спалучэньне рознай керамічнай пліткі, шпалеры, карнізы, фіранкі, праекты мэблі, дзьвярэй, кратаў. Хведар Ладуцька зноў езьдзіў са мной па базах і крамах і выбіраў усё сам, я ж толькі забясьпечвала магчымасьць "выбару".

Наступны клопат быў — мэбля. Яе трэба было спэцыяльна замаўляць. Паспрабавала дамовіцца на мэблевай фабрыцы — не атрымалася (маўляў, у іх шмат заказаў і нашу замову абяцалі выканаць няхутка). А нам жа трэба было найхутчэй.

Але калі ёсьць жаданьне нешта зрабіць для агульнай справы — вырастаюць крылы. І мэблю мы зрабілі, такую, як трэба (патрэбнага колеру і малюнку) і хутка. Дапамог прыватны кааператыў, у якім працаваў наш фронтавец Мікола Пратасаў.

Заставаліся карнізы. Па задуме мастакоў, яны павінны былі быць драўляныя, сьветлыя і цэльныя (гэта больш двух мэтраў). Замаўляла на фабрыцы ў Дзяржынску (гэта значыць Койданаве). Абяцалі зрабіць хутка, а потым пачалі зацягваць час. Прышлося і на іх націснуць.

Пакуль ішоў рамонт, заставалася яшчэ шмат клопату. Напрыклад, тэлефонныя нумары, якія ў савецкія і постсавецкія часы "здабыць" было надзвычай цяжка (тэлефонныя падстанцыі мелі скрозь вельмі старое абсталяваньне, якое ніяк не забясьпечвала патрэбы насельніцтва).

Папярэдняя арганізацыя мела тут два нумары. Нам паспрабавалі ўвогуле адмовіць у тэлефоне (нумары хацелі зьняць і перавесьці ў іншую арганізацыю). Прыйшлося таксама пазмагацца, бо чыноўнік-камуніст глядзеў на мяне (Фронт жа) зь нянавісьцю. Але дэпутацкі статус і "метал" у голасе пераламіў сітуацыю, і ён прапанаваў "апошні" варыянт: пакінуць ідзін нумар. Я не пагаджалася, але Вера Чуйко параіла згаджацца, бо, маўляў, ня будзе ніводнага нумару. Я ж саступіць нахабнаму камуністу ніяк не хацела. Параілася з Пазьняком, і ён пагадзіўся са мной, што трэба змагацца за два нумары. І пакуль чыноўнік ня здаўся і не пакінуў абодва нумары, я не адступілася.

Да пачатку І Зьезду беларусаў сьвету (1993 г.) сядзіба была адрамантаваная і абсталяваная — прыгожая, густоўная, сьветлая, вялікая і ўтульная. Разам зь беларусамі розных краінаў Эўропы і Амэрыкі мы адсьвяткавалі яе "адкрыцьцё".

Для найбольш актыўных сяброў на нашай "будоўлі" па прапанове З.Пазьняка была арганізаваная аўтобусная вандроўка па культурніцкіх мясьцінах Беларусі. Зянон Пазьняк, нягледзячы на занятасьць, ніколі не забываўся адзначыць ахвярнасьць нашых людзей дзеля Фронту, стараўся, каб іхняя праца была ўсімі заўважаная. Фронт замовіў аўтобус, і мы зрабілі сьвяточную вандроўку для самых актыўных працаўнікоў у нашым агульным фронтаўскім доме.

Пасьля і надалей я шмат займалася праблемамі функцыянаваньня сядзібы. У ёй жа пачалі стала працаваць сакратар Управы В.Івашкевіч і сакратарка канцылярыі Д.Мікульская (у штаце былі яшчэ прыбіральшчыца і бухгалтар).

Галоўнае патрабаваньне Пазьняка да працаўнікоў сядзібы было ў тым, каб тут было заўсёды чыста і ўтульна, каб нашыя паперы, дакуманты і г.д. нідзе не валяліся, каб усё было на сваіх месцах, каб людзям усьміхаліся. Атмасфэра ў сядзібе павінна была быць добразычлівая, адказы на тэлефонныя званкі — ветлівымі і па справе, каб усім, хто прыходзіў у Фронт, быў відаць наш высокі культурны ўзровень. Павінны быць кветкі, гарбата і кава.

Здавалася б, рэчы элемэнтарныя. Але, на жаль, усялякія дробязі трэба было кантраляваць (каб працаўнікі не спазьняліся на працу, каб не грубілі надакучлівым наведвальнікам і г.д.). Ня раз я была сьведкам, як Пазьняк цярпліва вучыў сакратарку правільна размаўляць па тэлефоне (так і не навучыў, потым звольніў). Тады гэта мне здавалася крыху дзіўным, і толькі потым, трапіўшы за мяжу і маючы магчымасьць параўнаць, я зразумела тую "максіму" Пазьняка, што ў Беларусі (як ён казаў) ніхто ня ўмее размаўляць па тэлефоне. Гэта праўда. Над гэтым раней неяк ня думалася, так прывучыліся да чужога хамства і бескультур'я.

Спачатку ў сядзібе было так, як хацелася, хораша і прыстойна. Але пазьней, калі я апынулася ў эміграцыі ў Варшаве (муж тады быў Нью-Ёрку), Галя Навумчык як карэспандэнт Радыё Свабода разы са два была на Беларусі. Прыехаўшы ў Варшаву, яна мне расказала, што сядзіба стала ўяўляць сабой зусім іншае: бруд, у будынку кураць, гавораць парасейску, яна нават бачыла ў сядзібе нецьвярозых і чула ненарматыўную лексіку. Гэта моцна рэзанула па сэрцы, перажыць такое пераўтварэньне мне было вельмі балюча. Муж па гэтаму поваду жартаваў, што кансэрватары імкнуцца падцягнуць нізы да нормы і схільныя да дыктатуры, а дэмакраты самі апускаюцца да нізоў, каб адлюстраваць іхныя інтарэсы, і схільныя да маразму. Жарцік жарцікам, але нешта ў гэтым ёсьць.

ПЕРШАЯ ЗДРАДА

Яшчэ ў студэнцтве ў адным з часопісаў я натыкнулася на ангельскі ўспамін пра 2-ю Сусьветную вайну. Вось яго сутнасьць. У тыя ваенныя часы ў Вялікабрытаніі былі "цяжкія" часы, амаль што голад. (Хоць, зразумела, мяркуючы па нашай рэчаіснасьці, які ў іх там быў "голад"!)

"Сапраўднае" мяса не прадавалася, і "галадаючыя" ангельскія грамадзяне ўжывалі ў асноўным курынае (што ў сьвеце лічыцца самым танным мясным прадуктам). Жонка аднаго вельмі высокапастаўленага ангельца кожны дзень атрымоўвала прадукты (здаецца, па картках), выглядала змучанай і стомленай. Тады, пашкадаваўшы яе, з пачуцьця вялікай павагі да яе і яе мужа, гандляр падмяніў ёй кавалак курынага мяса на дэфіцытны кавалак ялавічыны. Жанчына ўбачыла гэтую падмену толькі дома, але, абураная, прынесла яго назад, сказаўшы, што калі ўвесь народ "галадуе", гэты кавалак яны з мужам ніколі ня змогуць зьесьці. Асоба "вышэйшага" сьвету, прывыкшая да ўсяго "лепшага", была надзвычай годнай асобай і вышэй за ўсё ставіла свой гонар, які не падлягаў ніякаму "гандлю".

Гэты "просты" ўспамін тады вельмі моцна мяне ўразіў і ўспамінаецца заўсёды, калі прыходзіцца сутыкацца з тым, як утоптваецца чалавечы гонар у гразь. Асабліва цяжка бывае назіраць такую зьяву сярод блізкіх людзей адраджэнскага асяроддзя, бо аснову, стрыжань нашага народнага руху і нашага сяброўства з самага пачатку складалі прынцыпы высокай маралі. І Фронт пасьлядоўна ўвасабляў наш незалежніцкі ідэал у жыцьцё. Але адкуль тады "ўзялася" здрада ў тым сьветлым часе, дзе і калі яна "зарадзілася"?

Вострае чаканьне кардынальных зьменаў у канцы 80-х ахапіла ўсё нашае грамадзтва. І ў гэтай агульнай хвалі грамадзкага рушэньня апынуліся людзі з рознымі ўяўленьнямі пра будучыню Баларусі і з розным уласным маральным багажом.

У тыя посткамуністычныя часы ўсе мы разам змагаліся за незалежнасьць. Паступова падыходзіў новы час і новае жыцьцё, якое выставіла для некаторых іншыя "ідэалы". Так інфляцыя 90-х дала магчымасьць чыноўнікам скарыстацца агульнай бядой і нажыцца за народны кошт, у той час калі астатнія гублялі ўсё, што нажылі за жыцьцё.

У 1992 годзе, праз месяц-два пасьля майго вяртаньня з Італіі, дзе я суправаджала на аздараўленьне групу чарнобыльскіх дзяцей зь мястэчка Альманы, мне дадому патэлефанавала італьянка, якая там, у Італіі, разам зь іншымі апекавалася нашымі беларускімі дзецьмі. Яна паведаміла, што праз некалькі дзён прылятае з Рыму у Маскву і адразу цягніком едзе ў Менск на тыдзень-два (як атрымаецца).

Умовы майго жыльля мала адпавядалі для прыёму заходняй госьці (2-пакаёвая "хрушчоўка"), але найбольш мяне ўводзіла ў клопат тое, што ў мяне няма аўтамабіля, каб сустрэць і заапекавацца ёю на гэтыя дні.

На сэсіі Гарсавета я падзяілася сваёй "бядой" з калегам-дэпутатам, які быў кіраўніком аднаго буйнога прадпрыемства. Паколькі сітуацыя была зьвязаная з дабрачыннай дзейнасьцю, гэты дэпутат (нечакана для мяне) вырашае даць мне на два тыдні аўтамабіль з гаражу свайго прадпрыемства для сустрэчы замежнай госьці (на сваю адказнасьць і бясплатна). А паколькі я ня маю "правоў" на ваджэньне аўтамабіля, мы дамовіліся, што яго атрымае мой сябра Сяргей Міхноў, які ўсе гэтыя дні і будзе выступаць у ролі кіроўцы. "Даверанасьць" афармілі на маё імя і неяк пераафармілі на Сяргея.

Потым пляны ў госьці падкарэктаваліся, і яна вырашыла да адлёту з Масквы ў Італію паглядзець яшчэ і Маскву і выехала зь Менску раней. У гэты ж дзень мы з Сяргеем дамовіліся, што ён адразу вяртае аўтамабіль. Вечарам на пасяджэньні Управы БНФ Сяргей заверыў мяне, каб я не хвалявалася, што машына ўжо там, дзе была ўзятая. Назаўтра на сэсіі я падзячыла свайму калегу і паведаміла пра зварот машыны ў гараж яго прадпрыемства датэрмінова.

Прайшло каля тыдня. Раптам мне патэлефанавалі з ДАІ, што затрымалі службовы аўтамабіль і кіроўцу С.Міхнова, калі ён парушыў дарожныя правілы, а па дакумантах тэрміны эксплуатацыі зышлі ўжо некалькі дзён. Аказалася, што Сяргей прадаўжаў езьдзіць на машыне ў сваіх прыватных мэтах (рабіў нейкі свой бізнэс ці што), а мяне проста падмануў. Уся інфармацыя пра затрыманую машыну, зразумела, адразу была паведамлена і майму калегу-дэпутату.

Цяжка перадаць, які жудасны сорам я перажыла ў тыя часы. Нават і зараз, калі я ўспамінаю пра гэта, мне становіцца сорамна, дрэнна і цяжка.

Мы з сябрамі імгненна забралі машыну і аддалі яе ў гараж. Назаўтра мне прыйшлося глядзець у вочы свайго калегі... Ён дараваў мне, але мой аўтарытэт "чалавека слова" ў ягоных вачах быў страчаны.

У любой сітуацыі і ў любым часе ўсё залежыць ад маральнага стрыжня кожнай канкрэтнай асобы. Для моцных людзей паняцьці патрыятызму, дружбы, сяброўскага пляча не падлягаюць перагляду ні пры якіх умовах, для слабых і нікчэмных — гэтыя паняцьці існуюць да пары, пакуль яны не сутыкнуцца з уласнымі (асабістымі) інтарэсамі, і калі ў гэтым сутыкненьні "маё" перамагае — тут чакай бяды.

Цяжкімі мукамі сумленьня расплацілася я за свой давер. Але гэта былі мае, уласныя перажываньні. Зусім хутка я даведалася пра яшчэ большую здраду.

(Працяг будзе.)

ВОПРОС — ОТВЕТ

Пересадку роговицы проводят в 3-й Клинической больнице Минска

Можно ли в Беларуси в государственной клинике сделать лазерную коррекцию зрения? И второй вопрос: когда в нашей стране будет осуществляться пересадка роговицы?

Галина Васильева, Минск.

Такие операции, как пересадка роговицы, делают в Беларуси в 3-й Клинической больнице Минска уже более 60 лет. Еще в 30-е годы прошлого века ныне член-корреспондент Академии медицинских наук Татьяна Васильевна Бирич, которая заведовала кафедрой глазных болезней столичного медуниверситета с 1945-го по 1975 год, обучалась методикам пересадки роговицы у самого академика В.Филатова в Одессе. Она и научила всех своих учеников этому мастерству.

В настоящее время сотрудники кафедры глазных болезней БГМУ выполняют пересадку роговицы и другие пластические операции. При возникновении конкретной клинической ситуации, необходимости проведения хирургического лечения больным с бельмом роговицы специалисты обращаются в отдел биотрансплантатов Главного управления государственной службы медицинских судебных экспертиз и получают донорский материал.

Очередь на пересадку роговицы, сказали нам в консультативном центре 3-й Клинической больницы, в нашей стране практически отсутствует, все нуждающиеся получают такую помощь.

Что касается лазерной коррекции зрения, то до настоящего времени государственные учреждения здравоохранения лазерных установок для рефракционной хирургии не имеют. Есть планы, что такая аппаратура появится в Республиканском офтальмологическом центре при 10-й Клинической больнице. В настоящее время данные вмешательства производят только негосударственные медицинские учреждения.

Алеся КОВАЧ.

ИМЕЙ В ВИДУ

Следи за этикеткой

Почти половина торговых продовольственных точек столицы, в которых санитарно-эпидемиологической службой Минска была проведена проверка, работают с нарушениями.

Санэпидпроверка проводилась в феврале. Проверяющие обследовали 281 объект торговли. Проверка проводилась и в магазинах, и на рынках. Нарушения выявлены в 119 случаях. Причем на некоторых предприятиях продукты питания были настолько сомнительного качества, что приходилось составлять административные протоколы. 26 объектам торговли пришлось временно приостановить свою деятельность.

В основном нарушения касались сроков годности пищевых продуктов. Также были выявлены несоблюдение условий реализации пищевых продуктов, отсутствие документов на продукты, удостоверяющих их качество и безопасность. На некоторых объектах сырая продукция хранилась по соседству с готовыми продуктами питания, что является грубейшим нарушением санитарных норм.

Чтобы избежать покупки некачественных продуктов, специалисты санэпидслужбы советую покупателям тщательно изучать этикетку товара.

Игорь ЗАЛЕССКИЙ.

КОМПЕТЕНТНОЕ МНЕНИЕ

Рожать или не рожать?

В 2007 году в Беларуси впервые за последние 12 лет родилось более ста тысяч малышей, а точнее — 103 425.
Специалисты отмечают, что средний возраст рожающей впервые белоруски сместился к 24 годам, что, по мнению врачей, положительная тенденция.

О репродуктивном здоровье женщин и возможностях перинатальной службы страны рассказала на встрече с журналистами доктор медицинских наук, заместитель директора РНПЦ "Мать и дитя" **Ольга ХАРКЕВИЧ**.

«Главное, чтобы женщина была здорова»

Для начала немного статистики. В экономически развитых странах еще с начала 1980 годов стремительно росло число женщин, рожающих в возрасте под или за 40. За это время приблизительно на 90 процентов возросло количество рожениц среди женщин 35—39 лет. Сегодня в Европе "пожилой первородящей" называют женщину, которая собирается стать матерью в 35 лет. Хотя несколько лет назад так называли 28-летних рожениц. Существенный сдвиг возрастной планки для женщин, способных забеременеть и родить, произошел благодаря достижениям медицины и хорошим условиям жизни.

До недавнего времени эти тенденции белорусок как бы и не касались. У нас по-прежнему первый раз рожали, как правило, девушки в возрасте 20—22 лет. А роды после 40 казались чем-то удивительным и не очень-то приветствовались не только общественностью, но и врачами. Медики предупреждали, чем могут обернуться роды для немолодых родителей. Например, согласно статистике, риск родить малыша с болезнью Дауна у женщин после 35 значительно выше, чем у 25-летних. На 400 родов после 35 фиксируется один случай болезни Дауна у новорожденного, в то время как у 25-летних женщин — один случай на 1250 родов.

— В последнее время в Беларуси тоже увеличился возраст рожающей в первый раз женщины, — говорит Ольга Харкевич. — *Сегодня он составляет 24 года. Хотя в Великобритании, например, 35. Я думаю, что это нас тоже ожидает. Чем выше будет социально-экономический уровень развития страны, тем больше женщин будут рожать после 30. Сначала они будут учиться, делать карьеру, а потом рожать детей. Ничего нет в этом страшного. Главное, чтобы женщина была здорова. И тогда не имеет значения, в 25 или в 35 она рожает своего первенца.*

Радует также то, что сегодня в Беларуси значительно увеличивается число родов после 40. Это становится престижно. И это не должно беспокоить женщину. Недавно Всемирная организация здравоохранения опубликовала пять факторов, которые влияют на продолжительность жизни человека. И там поздние роды занимают 3-е место.

По мнению специалиста, беременности после 30 и даже после 40 белорускам не стоит опасаться и ввиду того, что сегодня оснащение перинатальной службы страны позволяет диагностировать, а чаще исключать, пороки развития зародыша на самых ранних сроках беременности — до 12 недель. Дородовые исследования уменьшают также опасность рождения сорокалетними женщинами детей с генетическими отклонениями: такие пороки развития плода тоже диагностируются на ранней стадии беременности.

Ольга Харкевич подчеркивает, что сегодня Беларусь приблизилась к лучшим показателям перинатальной смертности, таким, которые есть в развитых странах Европы, Японии. Детская смертность в стране составляет всего 5,8 случая на 100 тысяч родившихся младенцев, младенческая — 5, 2 на 100 тысяч населения.

«Эта беременность важнее жизни»

В последние годы в Беларуси увеличилось количество женщин, готовых родить ребенка, несмотря на серьезные болезни, которыми они страдают. Еще 5—10 лет назад таким женщинам медики категорически не разрешали рожать. А сегодня белорусские врачи совершают настоящие чудеса. Правда, по словам Ольги Харкевич, в таких ситуациях одного умения и квалификации врачей недостаточно. Вынашивать сложнейшие беременности стало возможным благодаря новейшим технологиям и современному оборудованию.

— Два года назад в нашем центре впервые родила женщина с тромбоэмболией легочной артерии (острая закупорка ветвей легочной артерии тромбами), — делалась успехами перинатальной службы страны Ольга Харкевич. — Женщина наблюдалась в нашем центре. В 16 недель беременности она перенесла клиническую смерть. Совместно с кардиохирургами и сосудистыми хирургами удалось ее прооперировать, удалить все тромбы. В этот же день была сделана повторная операция, женщине поставили кава-фильтр — специальную систему, которая препятствует поступлению тромбов в легочные артерии. Женщине было предложено прервать беременность. Но она категорически отказалась, потому что у нее погиб взрослый сын и она говорила, что эта беременность для нее важнее жизни. Роженица была с высшим образованием, фармаколог по специальности и понимала все риски.

С помощью врачей нашего центра она смогла выносить эту беременность до 37 недель. Ей было сделано кесарево сечение, родилась абсолютно здоровая девочка.

Еще один уникальный случай был зарегистрирован в нашем центре: ребеночка родила женщина с тяжелейшим пороком сердца. Подобные единичные случаи описаны только специалистами Великобритании и Германии. И нам это очень приятно.

Несколько лет назад мы помогали сохранить беременность пациентке из Могилевской области, которая страдала сочетанным пороком сердца. Из-за особенностей строения сердца, в организме женщины не было артериальной и венозной крови — только смешанная. Она тоже категорически отказывалась прерывать беременность, сохраняла беременность в нашем центре. К сожалению, роды случились в 28 недель беременности. Ребенок весил 1 кг 200 г, но, к счастью, был здоров. Его поместили в специальный инкубатор, позже ребенок и мама были выписаны домой.

Совсем недавно впервые в Беларуси родила ребенка женщина, страдающая нейродистрофией.

Хотела бы отметить, что сегодня детское реанимационное отделение нашего центра оснащено самым современным оборудованием, позволяющим выхаживать младенцев с чрезвычайно низкой массой тела, до 1 кг.

«В Беларуси действует четырехуровневая система родовспоможения»

Рожают в РНПЦ "Мать и дитя" в основном женщины, у которых диагностирована тяжелая патология либо выявлена патология у внутриутробно развивающегося младенца.

— Попасть к нам просто по желанию женщина не может, — говорит Ольга Харкевич. — Не существует в центре и платных услуг. Не надо забывать, что мы помогаем вынашивать детей беременным женщинам с очень тяжелыми патологиями. Есть специальный приказ Минздрава о госпитализации в РНПЦ "Мать и дитя". В нем указан перечень патологий, с которыми беременную женщину обязаны направить в наш центр. Хочу заметить, что в РНПЦ могут направить роженицу из любого района, даже самого отдаленного. Но для этого, повторюсь, должны быть показания.

Не надо забывать, что в Беларуси очень хорошо работает гинекологическая служба страны, в каждом областном центре функционируют хорошо оснащенные перинатальные центры. В стране действует четырехуровневая система родовспоможения. Первый уровень — это районные центры, где ведутся неосложненные роды, второй уровень — межрайонный перинатальный центр, где рожают женщины с некоторыми нетяжелыми видами патологий. Третий уровень — областной перинатальный центр с высокотехнологичным оборудованием и высококвалифицированными специалистами, где оказываются все виды современной родовспомогательной помощи, и наконец, четвертый уровень — РНПЦ "Мать и дитя".

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.

ТЕМ ВРЕМЕНЕМ

Медики прогнозируют ухудшение здоровья беременных женщин

Прогноз основан на данных о состоянии здоровья девушек-подростков. По мнению специалистов, процент абсолютно здоровых школьников в последние годы не превышает 25. К окончанию школы у большинства девушек (75%) диагностируются хронические заболевания. В последние годы значительно увеличилось количество родов, проходящих с осложнениями, которые являются следствием ухудшения общего состояния здоровья женщин. В 2007 году около 25% беременностей белорусских женщин прошли без осложнений.

Важнейшим фактором, влияющим на здоровье женщины, являются условия труда. По данным официальной статистики, в неблагоприятных условиях трудятся около 400 тыс. белорусских женщин, среди них половина — частные предприниматели.

РЭЦЫДЫЎ

У Беларусі расце колькасць бясплодных сямейных пар

Пра гэта паведаміла галоўны акушэр-гінеколаг Міністэрства аховы здароўя Святлана Шылава.

Паводле яе слоў, летась у Беларусі зарэгістравана 9649 выпадкаў жаночай бясплоднасці і 1799 — мужчынскай. Спецыяліст зазначыла, што сярод асноўных прычын бясплоднасці і пагаршэння рэпрадуктыўнага стану здароўя — інфекцыі, якія перадаюцца палавым шляхам, і аборты.

С.Шылава паведаміла, што ў Беларусі за апошняе дзесяцігоддзе ўзровень абортаў знізіўся больш чым у два разы ва ўсіх узроставых групах. Узровень падлеткавай цяжарнасці скараціўся з 37 на тысячу падлеткаў у 2000 годзе да 13,1 у 2007-м.

Гаворачы пра інфекцыі, якія перадаюцца палавым шляхам, спецыяліст зазначыла, што апошнім часам сярод жанчын зніжаецца колькасць захворванняў на сіфіліс, ганарэю, павялічылася толькі колькасць захворванняў на мікаплазмоз.

Таццяна ДАРАШЧОНАК, БелаПАН.

АФІЦЫЙНА

Цэны ў дзяржаўным стаматалагічным сектары адпавядаюць даходам пераважнай часткі насельніцтва

***Сямён НАВУМОВІЧ** — галоўны пазаштатны стаматолаг Міністэрства аховы здароўя, загадчык кафедры артапедычнай стаматалогіі БДМУ, доктар медыцынскіх навук:*

— У нас была калісьці ідэя атэстоўваць усе стаматалагічныя арганізацыі, і ў залежнасці ад іх аснашчанасці і кваліфікацыі медыцынскага персаналу прысвойваць ім тую ці іншую катэгорыю, ад якой залежала б цана на стаматалагічныя паслугі. Але пакуль што не ўсе дзяржаўныя стаматалагічныя арганізацыі могуць нароўні канкурыраваць па сваёй тэхнічнай аснашчанасці з прыватнымі стаматалагічнымі фірмамі. Мне вельмі прыемна канстатаваць, што пашырэнне ў дзяржаўных медыцынскіх установах платных стаматалагічных паслуг дазволіла нам апошнім часам істотна абнавіць парк стаматалагічнага абсталявання. Калі да 2002 года мы закуплялі ў год усяго 50 новых стаматалагічных установак па краіне, то з 2003 года, пасля пашырэння аказання платных стаматалагічных паслуг, мы пачалі закупляць штогод 250—280 новых установак. І калі гэтыя тэмпы захаваюцца і далей, то ў бліжэйшыя тры—пяць год мы зможам замяніць увесь свой састарэлы парк абсталявання. Мяркую, што праз пэўны час мы вернемся да ідэі прысваення стаматалагічным арганізацыям катэгорый.

А наконт завышаных цэн я не магу з вамі пагадзіцца. Справа ў тым, што ўсе прэйскуранты праходзяць абавязковы аналіз і ўзгадненне ў аддзеле цэн і цэнаўтварэння Міністэрства аховы здароўя. Сапраўды, цэны, устаноўленыя ў дзяржаўных арганізацыях, сёння ніжэйшыя, чым у прыватным сектары, але ні ў якім разе нельга рабіць на гэтай падставе высновы, што якасць стаматалагічных паслуг у нас горшая, чым у прыватнікаў. Проста цэны ў дзяржаўным стаматалагічным сектары ў большай ступені адпавядаюць узроўню даходаў пераважнай часткі нашага насельніцтва. Я прывяду вам адзін толькі прыклад, як змяняўся кошт металакерамічнай каронкі за апошнія тры гады: спачатку пацыенты плацілі за каронку 7 долараў, затым 16 і 26 долараў ЗША. Зараз яна каштуе ў межах 50 долараў ЗША. А ў нашых суседзяў-расіян металакерамічная каронка каштавала 120 долараў у дзяржаўным сектары яшчэ ў 1993 годзе. Ці варта здзіўляцца, што паслугамі беларускіх стаматолагаў вельмі ахвотна карыстаюцца замежныя грамадзяне. Дарэчы, у Расіі цэны на стаматалагічныя паслугі былі адпушчаны ў дзяржаўным сектары ў "свабоднае плаванне" яшчэ два гады таму. І ўвогуле, я магу гарантавана заявіць, што ў нас самыя нізкія цэны не толькі на постсавецкай прасторы, але і ва ўсім свеце.

— Не сакрэт, што адмена льгот на зубапратэзаванне была ўспрынята пенсіянерамі вельмі хваравіта...

— Ільготнікі былі фактычна нашым дзяржзаказам. І паверце, што мы былі зацікаўлены ў іх не менш, чым яны былі зацікаўлены ў нас. Каб не быць галаслоўным, прывяду вам адну толькі лічбу - на зубапратэзаванне льготнай катэгорыі насельніцтва дзяржава выдаткавала летась больш як 20 мільярдаў рублёў, або амаль што 10 мільёнаў долараў ЗША. У 2006 годзе гэта лічба складала 8,5 мільёна долараў ЗША. Сярэднестатыстычны льготнік "каштаваў" казне 180.700 беларускіх рублёў. А цяпер мы можам страціць пэўную частку сваіх пацыентаў. Калі да адмены льгот ўрач, які займаўся зубапратэзаваннем, прымаў па 10—12 пацыентаў за працоўную змену, то цяпер на прыём могуць прыйсці і тры, і пяць пацыентаў. А калі прыйшлі восем пацыентаў, то гэта лічыцца ўжо выніковым днём. Прызнаюся, што сітуацыя, якую нам даводзіцца сёння назіраць, не можа нас не хваляваць. Ад ранейшай колькасці пацыентаў, якія мелі права на льготы, засталося толькі каля 30 працэнтаў. Таму мы не імкнёмся рабіць ніякіх рэзкіх крокаў у бок павелічэння цэн, каб не адпудзіць нашых патэнцыяльных пацыентаў, асабліва сельскіх жыхароў, якія абслугоўваюцца, як правіла, на раённым узроўні. Для іх асабліва важна захаваць даступнае зубапратэзаванне.

zvyazda.minsk.by

ЗНАЕТЕ ЛИ ВЫ, ЧТО...

Белорусы чаще стали обследоваться на ВИЧ

Количество анонимных обследований в кабинете обследования отдела профилактики ВИЧ/СПИД Республиканского центра гигиены, эпидемиологии и общественного здоровья за последние 10 лет возросло более чем в два раза. Об этом БелаПАН сообщили в Республиканском центре гигиены, эпидемиологии и общественного здоровья.

В 1997 году анонимное обследование прошли 2325 человек, в 2000-м — 3465, в 2006-м — 5203, в 2007-м — 5854 человека (в том числе на ВИЧ — 1944 человека).

В кабинете проводятся обследования на ВИЧ-инфекцию, сифилис и маркеры парентеральных вирусных гепатитов "В" и "С", т.е. заболевания, ассоциированные с ВИЧ-инфекцией. Как сообщают специалисты, анонимное обследование на ВИЧ-инфекцию проводится бесплатно. Результат тестирования готов через один-два дня.

Храп — предвестник сердечных заболеваний

Исследование, проведенное венгерскими врачами, показало, что храп является одним из признаков возможных сердечных расстройств и инсульта, сообщают информационные агентства.

В ходе исследования были изучены истории болезней 12 тыс. пациентов. Оказалось, что пациенты, которые отличались сильным храпом, были более подвержены сердечным приступам (34%) и инсультам (67%) по сравнению с другими пациентами. Врачи подчеркивают, что такая зависимость была обнаружена только у людей с сильным храпом.

УВАГА!

У лесе цяпер будуць штрафаваць за ўсё!

Ніколі яшчэ ў гісторыі Беларусі не былі такімі вялікімі штрафы ў лесе. Так, за шклянку бярозавага соку цяпер можна страціць аж 1,5 мільёна.

Пра веснавы ўзлёт штрафаў паведаміў намеснік міністра лясной гаспадаркі Юрый Назараў:

— Па новым Адміністрацыйным кодэксе самавольная нарыхтоўка бярозавага соку лічыцца правапарушэннем. Адносіцца да наўмыснай шкоды альбо знішчэння дрэва. У ахоўваемых лясах штраф для фізічнай асобы — ад 620 тысяч рублёў да 1,55 мільёна. Індывідуальным прадпрымальнікам — да 6,2 мільёна. У лясах, якія не ахоўваюцца, штрафы для шарагоўца — ад 310 да 930 тысяч, а для ІП — ад 310 тысяч да 4,65 мільёна.

Вяскоўцам, якія жывуць пры лесе, здабываць для сябе лекавы бярозавы сок зараз не так проста. Для гэтага трэба абавязкова наведаць мясцовае лясніцтва і даведацца пра спецыяльна вызначаны ўчастак для нарыхтоўкі соку. Але і тут засечкі на дрэве мусіць пракантраляваць асабіста ляснічы альбо майстар. Інакш зноў-такі давядзецца плаціць штраф.

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

Як культурна выбраць чатырохколавага члена сям'і?

На мінулым тыдні ў Мінску адкрыўся першы ў краіне салон па продажы аўтамабіляў з прабегам, які мае гордую назву "Чатыры колы".

Карэспандэнт "Народнай волі" пабываў на адкрыцці салона.

Ужо ў першы дзень працы наведвальнікі прыцэньваліся да аўтамабіляў і распытвалі пра перавагі набыцця аўтамабіляў менавіта тут.

"Нашы людзі прызвычаіліся набываць усё на рынках — ад прадуктаў харчавання і да аўтамабіляў, — гаворыць дырэктар аўтасалона "Чатыры колы" **Аляксандр Рабушка**. — *Не сакрэт, што вялікая колькасць аўтамабіляў, якія ездзяць па нашых дарогах, набыты альбо на рынках, альбо па аб'явах. У людзей яшчэ не да канца сфарміравалася так званая аўтамабільная культура. Адной з галоўных задач нашага аўтасалона як раз-такі і з'яўляецца яе фарміраванне".*

Дарэчы, па інфармацыі старшага інспектара па вышуку аддзела аператыўнага рэагавання і вышуку УДАІ ГУУС Мінгарвыканкама **Дзмітрыя Ткачова**, у мінулым годзе ў Мінску на новых уладальнікаў былі зарэгістраваны 140 тысяч 694 аўто. З іх толькі каля васьмі тысяч набыты ў аўтасалонах.

У "Чатырох колах" пакуль прадстаўлены крыху больш за 100 аўтамабіляў. Тут ёсць і "Хамеры", і "Мерседэсы", і "Фольксвагены", "БМВ", "Аўдзі". Не сакрэт, што кошт канкрэтнага аўто залежыць ад яго прабегу. Чым больш кіламетраў наматаў на машыне яе папярэдні ўладальнік, тым ніжэй ягоная цана. Пакуль цэнавы дыяпазон прадстаўленых у салоне "чатырохколавых сяброў" вагаецца ў межах ад 10 тысяч умоўных адзінак.

"Але мы будзем арыентавацца на сярэдні кошт аўто ад 5 да 8 тысяч долараў", — гаворыць дырэктар салона.

Зразумела, што чалавека, які збірае грошы на аўтамабіль і рыхтуецца да пакупкі, хвалюе пытанне якасці машыны.

"Мы адказваем за якасць, бо разумеем, што для многіх машына — гэта сапраўдны член сям'і, — *кажуць у салоне. — На аўтарынках можна набыць няякасную альбо ўгнаную машыну. У ДАІ ёсць прыклады, калі людзі, набываючы аўто ў "Малінаўцы", толькі пры афармленні неабходных дакументаў у Дзяржінспекцыі даведваліся, што серыйныя нумары на іх перабіты. Аўтамабілі, якія рэалізуюцца ў салоне, ні ў якім разе не "бітыя", яны без крымінальнага мінулага. Прынцыповае адрозненне нашага салона ад аўтарынкаў — гэта тое, што мы даем трохмесячную гарантыю на карыстанне набытым у нас аўтамабілем. Акрамя таго, нашых*



кліентаў чакае кваліфікаваная дапамога ў дарозе, абслугоўванне на лепшых станцыях тэхнічнага абслугоўвання, магчымасць афармлення пакупкі ў крэдыт".

Прадставіць свой аўтамабіль у салон "Чатыры колы" можа любы жадаючы. Па жаданні такому аўтаўладальніку могуць прапанаваць іншы аўтамабіль. Яшчэ адной перавагай новага аўтасалона з'яўляецца і тое, што пры неабходнасці машыну могуць падабраць пад заказ: "Мы імпартуем аўтамабілі з краін Заходняй Еўропы, а таксама ЗША. Калі ў кліента ёсць жаданне, то мы можам падабраць для яго эксклюзіўны варыянт. Праўда, для гэтага патрабуецца перадаплата ў 30 працэнтаў ад кошту машыны", — дадае дырэктар аўтасалона.

Дарэчы, у бліжэйшых планах стварэнне філіялаў салона "Чатыры колы" ў іншых рэгіёнах Беларусі.

Віталь ГАРБУЗАЎ.

СКАЖЫ, ВІТАЛЬ...

Ці ўстаноўлена асоба Джаконды?

Ці праўда, што навукоўцы ўстанавілі асобу жанчыны, якая пазіравала Леанарда да Вінчы для знакамітай карціны "Джаконда"?

Зінаіда Рынейчык, Брэсцкая вобласць.

— Па меншай меры, нямецкія навукоўцы пра гэта заявілі "адназначна". Па іх меркаванні, на партрэце выяўлена жонка фларэнтыйскага купца Ліза дэль Джаконда.

Раней меркавалася, што на партрэце выяўлена тайная каханка геніяльнага мастака, а па іншай версіі — гэта зашыфраваны партрэт яго самога. Калі верыць дырэктару універсітэцкай бібліятэкі ў нямецкім Гельдэльбергу, то на адным з адбіткаў кнігі эпохі да Вінчы ад рукі напісана, што "Мона Ліза" — гэта жонка фларэнтыйскага купца. У сваю чаргу нямецкія навукоўцы адзначаюць, што ўладальнік гэтай кнігі быў сучаснікам італьянскага мастака і асабіста ведаў яго.

Якія краіны адмаўляюцца ад будаўніцтва АЭС?

Як вядома, у Беларусі распрацаваны план па падрыхтоўцы да будаўніцтва атамнай электрастанцыі. Гэтая навіна ўжо даўно хвалюе шырокую грамадскасць. У той жа час многія краіны свету адмаўляюцца ад такога будаўніцтва, бо разумеюць, што гэта можа быць небяспечна. Не магла б "Народная воля" дакладна назваць такія краіны?

Сяргей Русакевіч, Гомель.

— Калі ласка. У Аўстрыі, напрыклад, дзейнічае бестэрміновы мараторый на будаўніцтва АЭС. Распачатае ў 1978 будаўніцтва адзінай падобнай станцыі было спынена праз 8 гадоў.

У Бельгіі працуюць дзве АЭС з сямю рэактарамі. Але яшчэ на пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя было прынята рашэнне, якое фактычна забараняе будаўніцтва новых АЭС. Дарэчы, тэрмін службы дзеючых рэактараў тут заканчаецца ў 2025 годзе. Замяняць іх новымі ў Бельгіі не збіраюцца.

У Грэцыі спробы будаўніцтва АЭС былі зроблены ў 60—70-х гадах мінулага стагоддзя, але не былі рэалізаваны. Краіна цвёрда і паслядоўна выступае супраць будаўніцтва АЭС.

У Даніі яшчэ ў 1994 годзе было прынята рашэнне спыніць эксплуатацыю адзінай АЭС.

Гэты спіс можна працягваць і далей, але выснова адна: многія краіны свету супраць будаўніцтва АЭС.

Усё бывае ўпершыню

Падкажыце, калі ласка, калі ў кіно быў паказаны першы пацалунак?

Пётр Міхееў, Баранавічы.

Гэта здарылася ў 1886 годзе. Фільм Томаса Эдзісана даўжынёю ў 30 секунд так і называўся — "Пацалунак".

Дзе станавіцца на ўлік?

Па дагаворы найму я аформіў прапіску ў Мінскім раёне. Быў размеркаваны на дзяржаўнае прадпрыемства ў Мінск. Ці магу я стаць на чаргу па паляпшэнні жыллёвых умоў у Мінску ці Мінскім раёне?

Ігар Мяркулаў, Мінскі раён.

— У палажэнні аб парадку ўліку грамадзян, якім патрэбна паляпшэнне жыллёвых умоў ці прадастаўленне жылых памяшканняў з дзяржфонду, устаноўлена, што ўлік вядзецца мясцовымі выканаўчымі органамі па пастаянным месцы жыхарства людзей. Грамадзяне, якія не маюць ва ўласнасці жылых памяшканняў, становяцца на ўлік па месцы рэгістрацыі органамі ўнутраных спраў.

Акрамя таго, вы маеце права стаць на ўлік па паляпшэнні жыллёвых умоў (калі арганізацыя, дзе вы працуеце, мае ў карыстанні жылыя памяшканні) па месцы працы.

Ці вернуцца на сцэну «Тутэйшыя»?

Падкажыце, калі ласка, калі ў апошні раз на сцэне Купалаўскага тэатра быў паказаны культавы спектакль "Тутэйшыя". І ці чакаецца яго хуткае вяртанне ў рэпертуар?

Вера Смалькова, Мінск.

— Апошні раз спектакль быў паказаны 5 ліпеня 2007 года. З таго часу п'еса ні разу не значылася ў тэатральнай афішы.

Пэўны час хадзілі чуткі, што "Тутэйшых" увогуле забаранілі. Гаварылі, што бел-чырвона-белы сцяг, які ўздымаецца на сцэне ў канцы пастаноўкі (звычайна пад воклічы залы "Жыве Беларусь!), некаму з адказных чыноўнікаў муліў вока...

Аднак у тэатры гавораць, што "Тутэйшыя" вернуцца ў рэпертуар. Справа ў тым, што дэкарацыі для "Тутэйшых" трэба замяніць, і тэатр зарабляе для гэтага грошы. Акрамя таго, плануецца набраць новы склад акцёраў для "Тутэйшых". Пра канкрэтны тэрмін вяртання спектакля ў рэпертуар гаварыць пакуль не выпадае.

Свае пытанні ў рубрыку дасылайце на адрас: 220030, Мінск, вул.Энгельса 34а, рэдакцыя газеты "Народная воля" з паметкай "Скажы, Віталь...".

Вядучы рубрыкі Віталь ГАРБУЗАЎ.

ЖЕНСКИЙ ВЗГЛЯД

Ирина АЛЬХОВКА: *«Нам нужны не только розы...»*

В Беларуси проходит социальная кампания "Женские права и красивые слова". Основная цель кампании — противостояние домашнему насилию.

"До сих пор насилие над женщиной расценивается как частное дело, семейно-бытовая проблема, которая не должна "выноситься из избы", — говорит исполнительный директор объединения "Белорусская ассоциация молодых христианских женщин" Ирина АЛЬХОВКА. — *Многие и в XXI веке цитируют домостроевские правила, согласно которым жену можно бить палкой не толще большого пальца мужа. Мы слышали подобные слова даже от депутатов нашего парламента. И это страшно".*

В Беларуси, в отличие от России, Украины, Молдовы, до сих пор нет закона о домашнем насилии.

"Мы подсчитали, что стоимость домашнего насилия в Беларуси составляет 2.416.385.752 рубля (1.125.471 доллар США), — говорит Ирина Альховка. — *Прямые затраты жертвы и государства на одну ситуацию домашнего насилия составляют 883.828 белорусских рублей. В расчеты включались расходы женщины на доврачебную помощь, транспорт, бракоразводный процесс. Расходы государства состоят из оплаты работы врачей, участковых милиционеров, судебных работников, специалистов территориальных центров, к которым обращается пострадавшая, а также из средств, расходующихся на содержание женщины в больнице, приюте, содержание обидчика в ИВС. Расчет проводился только в отношении официально зарегистрированных 2734 случаев совершения семейно-бытового насилия в отношении женщин в течение 2006 года. Не считались затраты на посещение частных специалистов, съем квартиры, покупку необходимых вещей и другие, плохо поддающиеся подсчету расходы. Поэтому данный результат является неполным и заниженным. Сложна для подсчетов также оценка морального ущерба жертвы. Мы не можем подсчитать, сколько стоит выкидыш женщины, которую избил муж. Сколько стоят горе, боль и страдания, которые перенесла эта женщина? Как можно выразить в цифрах последствия того, что испытывают дети, видя, как папа бьет маму?*

Пострадавшим женщинам сложно и страшно говорить о своих проблемах. Они замазывают синяки, прячут следы побоев, стесняясь показывать свои проблемы, они не пишут или пишут, а потом забирают заявления в милицию, боясь гнева мужей, от которых им некуда уйти, от которых их никто не может защитить. И так будет продолжаться до тех пор, пока не будет, что предложить этим женщинам. Нельзя их обманывать, нельзя им говорить: "Расскажи, а мы посочувствуем". Сочувствие сегодня не в цене, нужны конкретные меры — закон, приюты. Нужно искоренять безнаказанность, чтобы жестокие мужья и партнеры, которые избивают женщин, знали, что они заплатят штраф, что они могут сесть в тюрьму за это. Необходимо постоянно говорить о том, что женщинам нужны не только розы, но и права, что семья заслуживает быть тем местом, в котором женщина чувствует себя в безопасности".

Ольга ПРУДНИКОВА.

ГАЗЕТА — ЧЫТАЧЫ

Вы яшчэ не зрабілі перадаплату за II квартал? Не спазніцеся!

Так, шаноўныя чытачы, многім з Вас неабходна зрабіць перадаплату за II квартал. Не адкладвайце гэта на апошнія дні месяца. У бліжэйшыя дні завітайце, калі ласка, у любы філіял "Беларусбанка" альбо ў паштовае аддзяленне і запоўніце бланк, узор якога мы друкуем кожны тыдзень. Нагадваем, мінчане могуць аператыўна зрабіць перадаплату таксама праз рэдакцыйны офіс (вул.Энгельса, 34а) альбо пазваніць па тэлефонах: 328-63-93 ці 328-68-71. Пасля званка да Вас прыйдуць нашы валанцёры са свежымі нумарамі газеты і дапамогуць аформіць перадаплату за любы тэрмін.

Нягледзячы на экстрэмальныя ўмовы выдання газеты, тарыфы па перадаплаце ранейшыя: на месяц — **9500** рублёў для індывідуальных чытачоў і **15.000** рублёў для арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў, фірм. Заўважым: паколькі кошт газеты пры рэалізацыі ў розніцу з новага года павысіўся, то выгадна рабіць **перадаплату** з тым, каб газета дастаўлялася дахаты.

Банкаўскія рэквізіты "Народнай волі" такія:

УП "Народная воля": Р/Р 3012006535014, ААТ "Пріорбанк", ЦБП 113, КОД 749, УНН 100961759.

Вымушаны і на гэты раз звярнуць увагу на тое, што перасылаць у рэдакцыю трэба не толькі копію плацежнага дакумента, але і запоўненую АБАНЕНЦКУЮ КАРТКУ, узор якой друкуем і ў сённяшнім нумары.

Зноў жа: запаўняйце выразна, пажадана друкаванымі літарамі. Разумеем: для тых, хто рабіць гэта будзе ўпершыню, не вельмі прыемная рэч. Але что зробіш: каб своечасова атрымліваць газету, мы вымушаны звяртацца з такой просьбай.

Вы — з «Народнай воляй», «Народная воля» — з Вамі.

0402280179

ИЗВЕЩЕНИЕ

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за январь, февраль, март, апрель, май, июнь 2008 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

Кассир

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за январь, февраль, март, апрель, май, июнь 2008 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

КВИТАНЦИЯ

Кассир М.П.

* Заполняется только при осуществлении операций по уплате налогов.

Абонентская карточка

на номера газеты «Народная воля»
за январь, февраль, март, апрель, май, июнь 2008 г.
(ненужное зачеркнуть)

Заполняется печатными буквами и обязательно отправляется в редакцию с копией платежного документа

фамилия
имя отч.
индекс почтового отделения
область
район
название населенного пункта
город, городской поселок, поселок, деревня (нужное — подчеркнуть)
улица пр-т переулок *(нужное— подчеркнуть)*
дом *д.,б.,в.,г.* корп. кв.

(Примечание: в случае получения газеты через абонентский ящик обязательно укажите индекс и адрес почтового отделения)

УСЛУГИ

Прием стеклотары, вторсырья и другая помощь инвалидам, пенсионерам г.Минска.

Тел. 8-033-661-11-87.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 3286871.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 3286904, 3286906
E-mail : nv@promedia.by
http://www.nv-online.info

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 11.03.2008 у 16.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 10 026 экз. Заказ №